Выходзіць 6 разоў у год. Выдаецца з 1996 г.

# БІБЛІЯТЭЧНЫ свет

НАВУКОВА-ПАПУЛЯРНЫ, ДАВЕДАЧНЫ, НАРМАТЫЎНЫ ВЫТВОРЧА-ПРАКТЫЧНЫ ЧАСОПІС

3/138 2024
май – чэрвень




**Заснавальнікі:**

ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА «НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ»

ГРАМАДСКАЕ АБ'ЯДНАННЕ «БЕЛАРУСКАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ»

**Галоўны рэдактар**
ЛЮДМІЛА КІРУХІНА

**Рэдакцыйная калегія:**
В. ГІГІН, старшыня рэдкалегіі
Л. ВЫСОЦКАЯ, намеснік старшыні
Т. АДАМЯН
Ю. ГАЛКОЎСКАЯ
Т. ЗАБІЯКА
М. ІГНАТОВІЧ
У. КУЛАЖАНКА
А. МАЦВЕЕВА
І. САРОКІНА
А. СТРЫЖЭВІЧ
Р. СУХАРУКАВА
В. ШУТАВА
С. ЮРЭЦКІ

**Вокладка:**
В. Пшыбытка, Д. Макарэвіч

**Дызайн, вёрстка:**
М. Аляксандрава, Д. Макарэвіч

**Рэдактар** Н. Люцко

**Адрас для пісьмаў:**
Пр. Незалежнасці, 116,
220114, г. Мінск

**Тэлефоны:**
(+375-17) 368-97-75,
293-27-68

**Факс:**
(+375-17) 368-97-23

**E-mail:**
kiryukhina@nlb.by
edit@nlb.by

https://www.facebook.com/bibliyatechnysvet/

**Выдавец:**
Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальная бібліятэка Беларусі»

**Паважаныя падпісчыкі!**
Падпісацца на часопіс можна ў аддзяленнях Белпошты і Белсаюздруку.

**Падпісныя індэксы:**
індывідуальны **74895**
ведамасны **748952**

## У нумары:

**Афіцыйна**

3 Загад Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «Аб зацвярджэнні складу журы XXXII Рэспубліканскага конкурсу "Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры"»

5 Загад Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «Аб выніках XXXII Рэспубліканскага конкурсу "Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры"»

**Па выніках конкурсу**

7 *НАТАЛЛЯ КАРНЕЙЧУК, ВОЛЬГА КАКШЫНСКАЯ.* У цэнтры ўвагі пераможцы XXXII Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»

**Да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў**

10 *СВЯТЛАНА МІРОНЧЫК.* Дзейнасць публічных бібліятэк Іўеўшчыны па патрыятычным выхаванні насельніцтва

15 *ТАТЬЯНА ЗАБИЯКО, СВЕТЛАНА КУРАШОВА.* Гомельский полк народного ополчения: история, подвиг, память

18 *МАРИНА КАМЛЮК.* Электронный проект «Листая истории страницы»

**Бібліяноч – тое, што нас аб'ядноўвае**

21 Библионочь-2024

**У публічных бібліятэках**

24 *СВЯТЛАНА АФАНАСЬЕВА.* Інавацыйная дзейнасць публічных бібліятэк Смаргоншчыны па захаванні гістарычнай памяці

25 *ГАННА СІМАНЕНКА.* Адэльск – мястэчка, якое было горадам

28 *ВАЛЯНЦІНА ХАРХАЛЁВА.* Мы гэтай краіны нашчадкі

It is published 6 times a year. Published since 1996.

# LIBRARY world

POPULAR SCIENCE, REFERENCE, REGULATORY, SCIENTIFIC AND PRACTICAL MAGAZINE

3/138 2024
May – June

**Founders:**

STATE INSTITUTION «NATIONAL LIBRARY OF BELARUS»

PUBLIC ASSOCIATION «BELARUSIAN LIBRARY ASSOCIATION»

**Chief Editor**
Lyudmila Kiryukhina

**Editorial Board:**
V. Hihin, Chairman of the Editorial Board
L. Vysotskaya, Deputy Chairman
T. Adamyan
Y. Galkovskaya
M. Ignatovich
V. Kulajenko
E. Matveeva
I. Sorokina
E. Strizhevich
R. Sukhorukova
V. Shutova
S. Yuretskiy
T. Zabiyako

**Cover** V. Pshibytko, D. Makarevich

**Design** M. Alexandrova, D. Makarevich

**Editor**
N. Lyutsko

**The address for letters:**
Nezavisimosti Ave, 116, 220114, Minsk, Belarus

**Telephones:**
(+375-17) 368-97-75, 293-27-68

**Fax:**
(+375-17) 368-97-23

**E-mail:**
kiryukhina@nlb.by
edit@nlb.by

https://www.facebook.com/bibliyatechnysvet/

**Publisher:**
State Institution «National Library of Belarus»

Subscription index:
Individual index **74895**
Departmental index **748952**

## In the issue

**Official**

3 Decree of the Ministry of Culture of the Republic of Belarus «On approval of the composition of the jury of the XXXII Republican competition “Library – center of national culture”»

5 Decree of the Ministry of Culture of the Republic of Belarus «On the results of the XXXII Republican competition “Library – center of national culture”»

**Based on the results of the competition**

7 *NATALIA KORNEYCHUK, OL’GA KAKSHINSKAYA.* Spotlight on the winners XXXII Republican competition «Library – center of national culture»

**To the 80th anniversary of the liberation of Belarus from the German-fascist invaders**

10 *SVETLANA MIRONCHIK.* Activities of public libraries of Ivye region on patriotic education of the population

15 *TATYANA ZABYAKO, SVETLANA KURASHOVA.* Gomel people’s militia regiment: history, feat, memory

18 *MARINA KAMLYUK.* Electronic project «Turning through history pages»

**Library Night – what unites us**

21 Library Night – 2024

**In public libraries**

24 *SVETLANA AFANASYEVA.* Innovative activity of public libraries of Smorgon’ to preserve historical memory

25 *ANNA SIMONENKO.* Odelsk is a small town that used to be a city

28 *VALENTINA KHARKHALYOVA.* We are descendants of this country

МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

# ЗАГАД

# ПРИКАЗ

10.04.2024 № 75

г. Мінск

г. Минск

Аб зацвярджэнні складу журы XXXII Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»

На падставе пунктаў 11 і 14 Інструкцыі аб парадку правядзення Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры», зацверджанай пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 26 снежня 2007 г. № 52,

ЗАГАДВАЮ:

1. Зацвердзіць склад журы XXXII Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» (далей – Рэспубліканскі конкурс) (прыкладаецца).

2. Дзяржаўнай установе «Нацыянальная бібліятэка Беларусі» забяспечыць:

да 16 красавіка 2024 г. накіраванне членам журы Рэспубліканскага конкурсу копій конкурсных матэрыялаў у лічбавай форме, аналітычных матэрыялаў аб удзельніках Рэспубліканскага конкурсу;

да 15 мая 2024 г. арганізацыю і правядзенне пасяджэння журы Рэспубліканскага конкурсу;

выраб дыпломаў пераможцаў Рэспубліканскага конкурсу і правядзенне цырымоніі ўзнагароджання.

Міністр А.М.Маркевіч

ЗАЦВЕРДЖАНА

Загад Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
ад 10.04.2024 № 75

Склад
журы XXXII Рэспубліканскага
конкурсу «Бібліятэка – асяродак
нацыянальнай культуры»

| | | |
|---|---|---|
| Грамада<br>Валерый Іванавіч | – | Першы намеснік Міністра культуры, старшыня журы |
| Карповіч<br>Ірына Уладзіміраўна | – | начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры, намеснік старшыні журы |
| Какшынская<br>Вольга Анатольеўна* | – | галоўны бібліятэкар навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства дзяржаўнай установы «Нацыянальная бібліятэка Беларусі», сакратар журы |
| Адамян<br>Таццяна Мікалаеўна* | – | дырэктар дзяржаўнай установы «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І.Леніна» |
| Вашчыла<br>Наталія Мікалаеўна* | – | дырэктар дзяржаўнай установы «Мінская абласная бібліятэка імя А.С.Пушкіна» |
| Забіяка<br>Таццяна Анатольеўна* | – | дырэктар дзяржаўнай установы «Гомельская абласная ўніверсальная бібліятэка імя У.І.Леніна» |
| Ігнатовіч<br>Марына Эдвардаўна* | – | дырэктар дзяржаўнай установы культуры «Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага» |
| Карнейчук<br>Наталля Віктараўна* | – | галоўны бібліятэкар навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства дзяржаўнай установы «Нацыянальная бібліятэка Беларусі» |
| Кароль<br>Людміла Канстанцінаўна* | – | вучоны сакратар установы культуры «Брэсцкая абласная бібліятэка імя М.Горкага» |
| Кірухіна<br>Людміла Генадзьеўна* | – | галоўны рэдактар рэдакцыі перыядычных выданняў і выданняў з працягам дзяржаўнай установы «Нацыянальная бібліятэка Беларусі» |
| Макарава<br>Вольга Валер'еўна | – | галоўны спецыяліст упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры |
| Матвеева<br>Алена Іванаўна* | – | дырэктар дзяржаўнай установы «Цэнтралізаваная сістэма публічных бібліятэк г. Мінска» |
| Сарокіна<br>Ілона Уладзіміраўна* | – | дырэктар установы культуры «Магілёўская абласная бібліятэка імя У.І.Леніна» |
| Швед<br>Таццяна Аляксееўна* | – | дырэктар дзяржаўнай установы «Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк г. Мінска» |

* З яго згоды (са згоды іх кіраўнікоў).

МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

ЗАГАД

ПРИКАЗ

23.05.2024 № 100

г. Мінск

г. Минск

Аб выніках XXXII Рэспубліканскага
конкурсу «Бібліятэка – асяродак
нацыянальнай культуры»

На падставе пункта 18 Інструкцыі аб парадку правядзення Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры», зацверджанай пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 26 снежня 2007 г. № 52, і пратакола пасяджэння журы XXXII Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» ад 07.05.2024 № 1,

ЗАГАДВАЮ:

1. Узнагародзіць пераможцаў XXXII Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» (далей – конкурс):

1.1. У намінацыі «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем»:

1.1.1. дыпломамі першай ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 50 базавых велічынь:

дзяржаўную ўстанову культуры «Іўеўская раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці;

Чурлёнскую сельскую інтэграваную бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Ганны Новік» Мінскай вобласці;

1.1.2. дыпломамі другой ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 40 базавых велічынь:

дзіцячую бібліятэку № 6 імя М.А. Астроўскага ўстановы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Бабруйска» Магілёўскай вобласці;

філіял «Зеляноцкая сельская бібліятэка» дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка Калінкавіцкага раёна» Гомельскай вобласці.

1.1.3. дыпломамі трэцяй ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 30 базавых велічынь:

дзяржаўную ўстанову «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка» Мінскай вобласці;

Домжарыцкую сельскую бібліятэку-філіял № 16 дзяржаўнай установы культуры «Лепельская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Віцебскай вобласці.

1.2. У намінацыі «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы»:

1.2.1. дыпломамі першай ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 50 базавых велічынь:

дзяржаўную ўстанову культуры «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка» Мінскай вобласці;

Адэльскую сельскую бібліятэку – цэнтр краязнаўства і турызму дзяржаўнай установы культуры «Гродзенскі раённы культурна-інфармацыйны цэнтр» Гродзенскай вобласці;

1.2.2. дыпломам другой ступені і грашовай прэміяй у памеры 40 базавых велічынь:

дзяржаўную ўстанову культуры «Лідская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы» Гродзенскай вобласці;

1.2.3. дыпломам трэцяй ступені і грашовай прэміяй у памеры 30 базавых велічынь:

цэнтральную гарадскую бібліятэку імя А.І. Герцэна дзяржаўнай установы «Сетка публічных бібліятэк горада Гомеля».

1.3. У намінацыі «За пошукавую і даследчую працу»:

1.3.1. дыпломамі першай ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 50 базавых велічынь:

Ляхавіцкую цэнтральную раённую бібліятэку імя Янкі Купалы дзяржаўнай установы культуры «Ляхавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Брэсцкай вобласці;

Астрынскую гарпасялковую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі» Гродзенскай вобласці;

1.3.2. дыпломамі другой ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 40 базавых велічынь:

бібліятэку мікрараёна Быхаў-1 дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка Быхаўскага раёна» Магілёўскай вобласці;

Лужкаўскую сельскую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Шаркаўшчынская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Віцебскай вобласці;

1.3.3. дыпломамі трэцяй ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 30 базавых велічынь:

дзяржаўную ўстанову «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка» Мінскай вобласці;

Ленінскую сельскую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Краснапольскага раёна» Магілёўскай вобласці.

1.4. У намінацыі «За падтрымку і развіццё чытання»:

1.4.1. дыпломамі першай ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 50 базавых велічынь:

дзяржаўную ўстанову культуры «Навагрудская раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці;

Махаўскую сельскую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Магілёўская раённая сетка публічных бібліятэк» Магілёўскай вобласці;

1.4.2. дыпломамі другой ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 40 базавых велічынь:

Мар’інагорскую гарадскую бібліятэку-філіял № 42 дзяржаўнай установы культуры «Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка» Мінскай вобласці;

філіял «Вярхоўская сельская бібліятэка» дзяржаўнай установы культуры «Бешанковіцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Віцебскай вобласці;

1.4.3. дыпломам трэцяй ступені і грашовай прэміяй у памеры 30 базавых велічынь:

філіял «Отарская сельская бібліятэка» дзяржаўнай установы культуры «Чачэрская цэнтральная раённая бібліятэка» Гомельскай вобласці.

2. Дзяржаўнай установе «Нацыянальная бібліятэка Беларусі» забяспечыць выплату грашовых прэмій названым у пункце 1 гэтага загада бібліятэкам за кошт сродкаў, прадугледжаных Міністэрству культуры на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2021–2025 годы. (падпраграма «Мастацтва і творчасць»).

Першы намеснік Міністра В.І.Грамада

**Наталля Карнейчук**



**Галоўны бібліятэкар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі**

# У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ ПЕРАМОЖЦЫ XXXII РЭСПУБЛІКАНСКАГА КОНКУРСУ «БІБЛІЯТЭКА – АСЯРОДАК НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ»

**Вольга Какшынская**



**Галоўны бібліятэкар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі**

7 мая 2024 г. у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ў анлайн-рэжыме былі падведзены вынікі XXXII Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» за 2023 год.

Конкурс праводзіцца штогод сярод публічных бібліятэк краіны ў два этапы (абласны і рэспубліканскі) па чатырох намінацыях: «За пошукавую і даследчую працу», «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем», «За падтрымку і развіццё чытання», «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы». Спачатку пераможцаў вызначылі ў абласных бібліятэках, дзяржаўнай установе «Цэнтралізаваная сістэма дзяржаўных публічных бібліятэк г. Мінска» і толькі пасля конкурсныя работы ацаніла прафесійнае журы.

Адпаведна з загадам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 10 красавіка 2024 г. № 75 «Аб зацвярджэнні складу журы XXXII Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» ў яго традыцыйна ўвайшлі прадстаўнікі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, абласных бібліятэк, цэнтралізаваных сістэм публічных і дзіцячых бібліятэк г. Мінска.

У конкурсе прынялі ўдзел 39 публічных бібліятэк: 15 цэнтральных бібліятэк і 24 бібліятэкі-філіялы.

На гэты раз толькі Гродзенская вобласць прадставіла на конкурс 8 работ, як патрабавала інструкцыя. Таму пажадана, каб іншыя рэгёны краіны прымалі больш актыўны ўдзел у конкурсе, што, безумоўна, будзе садзейнічаць актывізацыі патэнцыялу бібліятэк у справе адраджэння нацыянальнай культуры, гісторыі, літаратуры, мовы, фальклорна-этнаграфічнай спадчыны.

Бібліятэкамі-канкурсантамі была шырока прадстаўлена патрыятычная тэматыка. Асаблівую цікавасць у журы выклікалі конкурсныя работы, прысвечаныя падзеям Вялікай Айчыннай вайны, гісторыі краіны.

У кожнай намінацыі матэрыялы ўтрымлівалі змястоўныя і якасныя распрацоўкі, якія адказвалі сучасным патрабаванням і з'яўляліся дадатковым інструментам для

Табліца. Колькасць бібліятэк – удзельніц XXXII Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»

| Вобласць | Усяго работ | Намінацыя | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | за значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем | | за навацыі ў галіне бібліятэчнай справы | | за пошукавую і даследчую працу | | за падтрымку і развіццё чытання | |
| | | ГБ, РБ* | Г/п, СБ** | ГБ, РБ | Г/п, СБ | ГБ, РБ | Г/п, СБ | ГБ, РБ | Г/п, СБ |
| Брэсцкая | **5** | 1 | 1 | 1 | | 1 | | 1 | |
| Віцебская | **5** | | 1 | | | 1 | 1 | 1 | 1 |
| Гомельская | **7** | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 | | 1 |
| Гродзенская | **8** | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 |
| Магілёўская | **6** | 1 | | 1 | 1 | 1 | 1 | | 1 |
| Мінская | **7** | 1 | 1 | 1 | | 1 | 1 | 1 | 1 |
| г. Мінск | **1** | 1 | | | | | | | |
| УСЯГО | **39** | **6** | **5** | **5** | **3** | **6** | **5** | **4** | **5** |

* Гарадская бібліятэка, раённая бібліятэка.

** Гарпасялковая, сельская бібліятэка.

выкарыстання не толькі ў выхаваўчым працэсе, але і ў адукацыйным. Усе конкурсныя работы былі аформлены ў розных тэхніках дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Вызначэнне пераможцаў XXXII Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» адбывалася з дапамогай пісьмовага галасавання членаў журы. Кожнаму неабходна было запоўніць ліст апытання і вызначыць пераможцаў сярод бібліятэк, размешчаных у горадзе, і бібліятэк, размешчаных у пасёлках гарадскога тыпу, сельскіх населеных пунктах (першае, другое і трэцяе месцы), і адзначыць бібліятэкі да заахвочвання. У мэтах атрымання аб'ектыўнай адзнакі члены журы не ацэньвалі матэрыялы сваёй вобласці. Выбар пераможцы вызначаўся праз вылічэнне сярэдняга арыфметычнага.

Па выніках конкурсу дыпломамі першай, другой і трэцяй ступеней была адзначана 21 публічная бібліятэка. Пераможцы атрымаюць узнагароды адпаведна з загадам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 25 мая 2024 г. № 100 «Аб выніках XXXII Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры». Бібліятэкі-дыпламанты першай, другой і трэцяй ступеней атрымаюць грашовыя прэміі ў памерах 50, 40 і 30 базавых велічынь адпаведна.

Паведамім пра асноўныя дасягненні бібліятэк-пераможцаў, якія атрымалі дыпломы першай ступені ў кожнай намінацыі.

Найбольшая колькасць работ была прадстаўлена ў дзвюх намінацыях – «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем» і «За пошукавую і даследчую працу» – 11 работ.

Першае месца сярод гарадскіх і раённых бібліятэк у намінацыі «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем» заняла *дзяржаўная ўстанова культуры «Іўеўская раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці* за грамадзянска-патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення і рэалізацыю праекта «Беларускі чацвер» (2021–2023). Работа ў межах праекта ладзілася па асобных накірунках (цыклах): «Фальклорная мазаіка» (2021), «Мы малюем Беларусь!» (2022) і «НеВядомая беларуская літаратура» (2023) з выкарыстаннем інтэрактыўных форм і метадаў работы.

Станоўчым вынікам рэалізацыі праекта стала цікавасць дзяцей і падлеткаў да пазнання вялікай і малой радзімы, нацыянальнай літаратуры, гісторыі і культуры. На падставе распрацаваных матэрыялаў былі створаны электронныя інфармацыйныя рэсурсы «Беларускі чацвер. Мы малюем Беларусь!» і «Беларускі чацвер. НеВядомая беларуская літаратура!», якія прадстаўлены на сайце бібліятэкі.

Сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці, адзначана *Чурлёнская сельская інтэграваная бібліятэка дзяржаўнай установы культуры «Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Ганны Новік» Мінскай вобласці* за комплексную працу з дзецьмі і падлеткамі ў рамках рэалізацыі культурна-этнаграфічнага праекта «Кросны» (2021–2023). Праект прадугледжваў стварэнне ў бібліятэцы цэнтра лакальнай культуры, дзе сабрана інфармацыя па гісторыі мясцовасці, калгаса і ўстаноў. У межах праекта ладзіліся абрадныя мерапрыемствы, кулінарныя падарожжы па родным краі, паход за лекавымі травамі, урокі ткацкага майстэрства і г. д.

За час існавання праекта бібліятэкарамі сабраны і аформлены шэраг краязнаўчых папак: «Гісторыя Чурлёнскай зямлі», «Гісторыя Чурлёнскай школы», «Мясцовы фальклор» і інш.

У намінацыі «За пошукавую і даследчую працу» першае месца атрымала *Ляхавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя Янкі Купалы дзяржаўнай установы культуры «Ляхавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Брэсцкай вобласці* за рэалізацыю і стварэнне электроннай БД «Зямля яднае і ўзбагачае: гісторыя сельскіх гаспадарак Ляхавіччыны». Рэсурс змяшчае інфармацыю аб калгасах, што існавалі на тэрыторыі Ляхавіцкага раёна ў час БССР і аб сучасным стане сельскай гаспадаркі: назвах калгасаў, іх месцазнаходжанні, датах заснавання, аб'яднання і закрыцця, аб кіраўніках і ўдзельніках калгасаў, іх дасягненнях.

База даных складаецца з некалькіх раздзелаў: «Гісторыя», «Калгасы», «Персаналіі», «Кіраўнікі», «Сучаснасць»; распрацаваны тры віртуальныя турыстычныя маршруты. Матэрыял размешчаны на сайце Ляхавіцкай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы і з'яўляецца важным інструментам для вывучэння гісторыі БССР і разумення ролі калгасаў у жыцці краіны.

Сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці, вылучана *Астрынская гарпасялковая бібліятэка дзяржаўнай установы культуры «Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі» Гродзенскай вобласці* за рэалізацыю праекта «Экспедыцыя памяці» (2022–2023) па зборы матэрыялаў пра генацыд беларускага народа на тэрыторыі Астрынскага сельскага савета, стварэнне інтэрактыўнай карты «Взгляд в историю Острино» і віртуальнай Кнігі памяці «І зноў памяць вяртаецца да вайны». Бібліятэкар збірала інфармацыю ў розных відах і фарматах: рукапісныя

ўспаміны ветэранаў, відэаўспаміны, копіі дакументаў з сямейных архіваў: фатаграфіі, дзённікі, лісты, паштоўкі, артыкулы з газет, узнагародныя пасведчанні і г. д. Унікальныя па сваім змесце матэрыялы пастаянна запатрабаваны настаўнікамі, краязнаўцамі, вучнямі, мясцовымі жыхарамі.

У намінацыю «За падтрымку і развіццё чытання» бібліятэкамі было даслана 9 работ.

Першае месца сярод гарадскіх і раённых бібліятэк прысуджана *дзяржаўнай установе культуры «Навагрудская раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці* за папулярызацыю кнігі і чытання з дапамогай серыі культурных дыялогаў, якія прайшлі ў межах асветніцкага праекта «Вялікія кнігі – Вялікія справы». Мэтай культурных дыялогаў стала папулярызацыя дасягненняў Навагрудскага раёна ў спалучэнні з адметнымі выданнямі сацыяльна значнай літаратуры Беларусі. Кожнае мерапрыемства ўключала дыялог з запрашэннем людзей і прэзентацыю кніг з аглядам літаратуры па пэўных кірунках дзейнасці, справа якіх мела вялікае значэнне для развіцця раёна, вобласці, грамадства ў цэлым.

На сустрэчах культурных дыялогаў збіралася мазаіка для вялікага пано (Навагрудскі «Букет Міру») у выглядзе кветак і значных падзей, у выніку чаго атрымалася сімвалічнае адлюстраванне прафесійнай дзейнасці навагрудчан.

Сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці, лепшай прызнана *Махаўская сельская бібліятэка дзяржаўнай установы культуры «Магілёўская раённая сетка публічных бібліятэк» Магілёўскай вобласці* за рэалізацыю доўгатэрміновага літаратурна-творчага праекта «Бабуліна казка на падушках», мэтай якога з'яўляецца знаёмства дзяцей малодшага школьнага ўзросту з традыцыямі беларускага народа праз музейныя экспанаты, рэканструкцыі абрадаў, найлепшыя ўзоры класічнай і сучаснай дзіцячай літаратуры на беларускай мове, а таксама за рэалізацыю праекта па патрыятычным выхаванні падрастаючага пакалення, папулярызацыю краязнаўчых ведаў «Здесь мой край. Здесь я живу», рэалізацыя якога ажыццяўляецца ў цесным супрацоўніцтве з Махаўскай сярэдняй школай.

У намінацыі «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы» на разгляд журы было даслана 8 работ.

На першае месца сярод гарадскіх і раённых бібліятэк намінавана *дзяржаўная ўстанова культуры «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка» Мінскай вобласці* за стварэнне і рэалізацыю патрыятычнага праекта «Сиреневый код Солигорска», выкарыстанне інавацыйных форм работы: сацыял-эстафет, краязнаўчых батлаў, інтэрактыўных гульняў, анлайн-урокаў. Праект накіраваны на фарміраванне ў падрастаючага пакалення пачуцця любві да Радзімы, адказнасці за лёс краіны, далучэнне да гістарычных, культурных і маральных каштоўнасцей, традыцый свайго народа, захаванне памяці аб земляках, ветэранах Вялікай Айчыннай вайны [1, с. 6].

Упершыню быў распрацаваны сацыяльна-пазнавальны аўдыятур «Приглашаем в DREVOград!», які ўтрымлівае цікавыя і ўнікальныя матэрыялы, захапляльныя гісторыі аб кожнай расліне, аўтарскія фота.

Сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці, выклікала найбольшую цікавасць у журы і стала пераможцам *Адэльская сельская бібліятэка – цэнтр краязнаўства і турызму дзяржаўнай установы культуры «Гродзенскі раённы культурна-інфармацыйны цэнтр» Гродзенскай вобласці* за пашырэнне турыстычнай прывабнасці мясцовасці, доступ насельніцтва і гасцей аграгарадка да інфармацыйных рэсурсаў з выкарыстаннем традыцыйных і найноўшых бібліятэчна-інфармацыйных тэхналогій у межах краязнаўчага праекта «Ад вытокаў у будучыню»; стварэнне віртуальнай інтэрактыўнай карты «Мястэчка, якое было горадам. Падарожжа па аграгарадку Адэльск» – структураванага інфармацыйнага комплексу мясцовых матэрыялаў, якія дазваляюць забяспечыць арганізацыйнае, інфармацыйнае суправаджэнне мерапрыемстваў; адкрыццё музейнага пакоя драўляных музычных інструментаў, агульная колькасць якіх складае больш за 130 экспанатаў.

Конкурс завершаны, вылучаны лепшыя публічныя бібліятэкі Рэспублікі Беларусь у справе развіцця нацыянальнай культуры, прапаганды яе здабыткаў, збіранні і распаўсюджванні фальклорна-этнаграфічнай спадчыны. Пачаўся адлік часу для набыцця новага прафесійнага вопыту, каштоўных напрацовак да XXXIII Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры».

ЛІТАРАТУРА

1. **Вавилова, Е.** Через веточку сирени рассказали о войне… Из опыта работы патриотического проекта «Сиреневый код Солигорска» / Екатерина Вавилова // Бібліятэчны свет. – 2023. – № 4. – С. 6–10.

Summary

The article summarizes the XXXII Republican contest “Library is space national culture”.

Святлана Міранчык

# ДЗЕЙНАСЦЬ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК ІЎЕЎШЧЫНЫ ПА ПАТРЫЯТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ НАСЕЛЬНІЦТВА



**Дырэктар Іўеўскай раённай бібліятэкі**

Бібліятэкі заўсёды былі і застаюцца цэнтрамі культуры і асветы для самых шырокіх пластоў насельніцтва. Яны неад'емная частка інтэлектуальнага і сацыяльнага развіцця кожнага чалавека. Значэнне бібліятэк у жыцці грамадства, гісторыі яго культуры цяжка пераацаніць.

Дзяржаўная ўстанова культуры «Іўеўская раённая бібліятэка» ўносіць важкі ўклад у фарміраванне сацыякультурнай сферы рэгіёна.

*На тэрыторыі Іўеўскага раёна да ўстанаўлення савецкай улады не было культурна-асветніцкіх устаноў, якія адпавядалі б інтарэсам простага народа. Існавалі невялікія прыватныя бібліятэкі, даступныя толькі шляхетным людзям. Пачынаючы з 1926 г., пасля стварэння беларускай сялянска-працоўнай абшчыны, на Іўеўшчыне былі спробы адкрыць хаця б некалькі бібліятэк.*

*Пасля вызвалення Іўеўшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў пачалася праца па стварэнні бібліятэчнай сеткі раёна. У студзені 1945 г. пачала працаваць Іўеўская раённая бібліятэка. У сярэдзіне 1970-х гг. бібліятэкі функцыянавалі ў кожным буйным населеным пункце.*

*Новы этап у дзейнасці бібліятэк пачаўся з 1978 г., калі бібліятэкі раёна былі аб'яднаны ў адзіную цэнтралізаваную бібліятэчную сістэму, у якую ўвайшлі 64 установы.*

*З 2015 г. Іўеўская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма перайменавана ў дзяржаўную ўстанову культуры «Іўеўская раённая бібліятэка».*

Зараз 10 публічных бібліятэк раёна ажыццяўляюць арганізацыю бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва, выконваюць шырокі спектр культурна-інфармацыйных паслуг для насельніцтва, арганізуюць вольны час карыстальнікаў бібліятэк.

Работа перасоўнай бібліятэкі-бібліёбуса – арганічна ўпісваецца ў сістэму абслугоўвання аддаленых вёсак і маланаселеных пунктаў і стварае новы сацыяльны фармат жыцця вяскоўцаў.

Некалькі гадоў таму быў створаны сайт Іўеўскай раённай бібліятэкі (http://ivie-lib.by), які ў мінулым годзе стаў лаўрэатам XX юбілейнага конкурсу «Інтэрнэт-прэмія "ТІБО-2023"» і заняў III месца ў намінацыі «Адукацыя і навука». Яшчэ ўстанова пашырыла сваю прысутнасць у вэб-прасторы праз выкарыстанне сацыяльных сетак «Одноклассники» (https://ok.ru/group/54771828588546), «ВКонтакте» (https://vk.com/ivie_lib), відэахостынгу YouTube і мэсанджара Telegram-канал (https://t.me/ivielib).

З іх з'яўленнем бібліятэка перайшла ў анлайн-прастору, стала больш даступнай для чытачоў і атрымала практычна неабмежаваную аўдыторыю. Разам з тым супрацоўнікам даводзіцца пастаянна вучыцца, каб спалучаць традыцыйныя бібліятэчныя тэхналогіі з новымі тэхнічнымі магчымасцямі. Бібліятэкары асвойваюць розныя тэхнікі прэзентацый, відэаздымкаў, фатаграфавання. Некалькі гадоў таму нельга было ўявіць сабе, што нам давядзецца займацца вядзеннем сацсетак, здымаць ролікі, запісваць аўдыя. А зараз гэта стала часткай нашай паўсядзённай працы.

Супрацоўнікамі бібліятэкі створаны дзве электронныя базы даных уласнай генерацыі – «Знакамітыя землякі» і «Помнікі гісторыі і культуры Іўеўшчыны», якія размешчаны на сайце дзяржаўнай установы культуры «Іўеўская раённая бібліятэка».

Інфармацыйныя рэсурсы садзейнічаюць глыбокаму пазнанню гісторыі роднага краю, узбагачэнню ведаў пра знакамітых асоб – ураджэнцаў Іўеўскай зямлі, якія праславілі Беларусь, фарміруюць пачуццё гонару за сваю малую радзіму. Яны пастаянна папаўняюцца новымі звесткамі і імёнамі.

Доступ карыстальнікаў да прававой інфармацыі забяспечваюць пяць публічных цэнтраў прававой інфармацыі.

У пачатку 2024 г. на базе публічнага цэнтра прававой інфармацыі Іўеўскай раённай бібліятэкі пачаў дзейнічаць праект «Прававы экспрэс», які накіраваны на фарміраванне прававой культуры моладзі. У бягучым годзе ў рамках праекта прайшлі прававая дыскусія «Правы і абавязкі школьніка», інфармацыйны рынг «Я маю права, я абавязаны», актуальны дыялог «Сябруем з законам». Падчас мерапрыемстваў вучні знаёміліся з магчымасцямі інфармацыйна-пошукавай сістэмы «Эталон», рэсурсамі ПЦПІ бібліятэкі, сустракаліся з супрацоўнікамі натарыяльнай канторы Іўеўскага раёна.

Штогод у дзяржаўнай установе культуры «Іўеўская раённая бібліятэка» праводзяцца разнастайныя мерапрыемствы, сярод якіх – святы, акцыі, сустрэчы з цікавымі людзьмі і пісьменнікамі, прэзентацыі выданняў, экскурсіі па бібліятэцы, літаратурна-патрыятычныя кампазіцыі, семінары, круглыя сталы, дыспуты, дыскусіі і інш.

Асноўнымі напрамкамі дзейнасці бібліятэк раёна з'яўляюцца: вывучэнне гісторыі свайго краю і назапашванне краязнаўчых матэрыялаў, прапаганда творчасці беларускіх пісьменнікаў, патрыятычнае, экалагічнае, эстэтычнае выхаванне падрастаючага пакалення, прапаганда здаровага ладу жыцця і інш.

Шматгадовая пошукава-даследчая праца супрацоўнікаў дазваляе выкарыстоўваць назапашаны матэрыял для ўдзелу ў розных конкурсах і дае свае пэўныя вынікі. За час існавання Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» бібліятэкі раёна 23 разы прымалі ў ім удзел, 19 з іх выходзілі пераможцамі.

У гэтым годзе Іўеўская раённая бібліятэка таксама ў ліку пераможцаў XXXII Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры». За рэалізацыю праекта «Беларускі чацвер» і стварэнне электроннага інфармацыйнага рэсурсу «Беларускі чацвер. НеВядомая беларуская літаратура» ў намінацыі «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем» бібліятэка адзначана дыпломам першай ступені.

Настойліва і планамерна калектыў займаецца духоўна-маральным выхаваннем дзяцей і моладзі, царкоўна-гістарычным краязнаўствам. Гэтаму садзейнічае плённае супрацоўніцтва са святарамі. Як вынік – чатыры перамогі ў рэспубліканскім конкурсе «Бібліятэка – цэнтр духоўнай асветы і выхавання».

У сучасных умовах праблема грамадзянска-патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення ў нашай краіне набыла асаблівую значнасць. Не сакрэт, што сёння многія дзеці і падлеткі добра ведаюць знакавыя падзеі з гісторыі іншых краін, свабодна валодаюць замежнымі мовамі і лічаць, што ў гісторыі і культуры роднай краіны няма нічога, што б заслугоўвала ўвагі. Аднак прычына такіх адносін, на наш погляд, заключаецца ў нізкім узроўні дасведчанасці падрастаючага пакалення пра гісторыка-культурную спадчыну Беларусі, падзеі мясцовай гісторыі і ў адсутнасці цікавасці да лёсу сваёй Радзімы.

Сёння сам час патрабуе далучаць новае пакаленне да беларускай нацыянальнай культуры, паглыбляць знаёмства з родным краем, беларускімі традыцыямі, фальклорам, прывіваць любоў да Радзімы. Вывучэнне жыцця нашых продкаў важна для людзей рознага ўзросту. Менавіта родная культура, мова з'яўляюцца сувязным звяном да агульначалавечых каштоўнасцей, вытокаў народнай мудрасці.

Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне дзяцей і падлеткаў – адзін з прыярытэтных напрамкаў работы дзяржаўнай установы культуры «Іўеўская раённая бібліятэка».

Бібліятэка валодае вялікім выхаваўчым патэнцыялам у гэтым кірунку, які рэалізуецца праз далучэнне падрастаючага пакалення да чытання літаратуры на роднай мове, народных традыцый, свят і абрадаў, грамадзянска-прававых і нацыянальных каштоўнасных арыенціраў, гісторыі і сённяшняга жыцця краіны. Выхаваўчая работа бібліятэкі ў дадзеным кірунку адлюстроўваецца ў розных па сваёй форме і змесце мерапрыемствах і вядзецца ў цесным супрацоўніцтве з органамі мясцовай улады, грамадскімі і дзяржаўнымі арганізацыямі, мясцовымі гісторыкамі і краязнаўцамі.

Бібліятэкары знаходзяцца ў пастаянным пошуку новых падыходаў у ажыццяўленні патрыятычнага выхавання. Каб павысіць якасць гэтай работы, забяспечыць яе мэтанакіраванасць і сістэматычнасць, зацікавіць дзяцей нацыянальнай літаратурай, гісторыяй

і культурай быў распрацаваны і рэалізаваны праект «Беларускі чацвер».

На працягу 2021–2023 гг. работа ў межах праекта ладзілася па асобных кірунках: «Фальклорная мазаіка» (2021), «Мы малюем Беларусь!» (2022) і «НеВядомая беларуская літаратура» (2023).

Пры падрыхтоўцы і правядзенні мерапрыемстваў у рамках праекта выкарыстоўваліся цікавыя і падчас унікальныя краязнаўчыя матэрыялы (архіўныя дакументы, прадметы старадаўняга побыту і г. д.), назапашаныя ў працэсе пошукава-даследчай дзейнасці, вывучэння і захавання інфармацыі пра гісторыка-культурную спадчыну роднага краю; ужываліся інтэрактыўныя формы і метады работы, калі дзеці з'яўляюцца не пасіўнымі слухачамі, не аб'ектамі выхаваўчага ўздзеяння, а актыўнымі ўдзельнікамі.

Задачай бібліятэкараў было не столькі даць падрыхтаваную інфармацыю, колькі захапіць падлеткаў агульнай справай, стварыць сітуацыю, якая выкліча моцны эмацыянальны рэзананс, зацікавіць тэмай і падштурхне да самастойнага паглыблення ведаў.

Цыкл мерапрыемстваў «Фальклорная мазаіка» быў прысвечаны народнаму мастацтву беларусаў: вусна-паэтычнай творчасці, народным традыцыям, святам, звычаям і абрадам. Для дзяцей і падлеткаў праводзіліся гадзіны фальклору, вечары народных традыцый, фальклорныя пасядзелкі і г. д.

Агульная мэта праведзеных мерапрыемстваў – нагадаць падрастаючаму пакаленню, адкуль нашы карані, вытокі, а таксама даць магчымасць задумацца, што сапраўдная каштоўнасць нашага жыцця – жыць у згодзе і радасці, вучыцца ў нашых продкаў мудрасці, помніць іх запаветы.

У межах праекта «Беларускі чацвер. Фальклорная мазаіка» было наладжана цеснае супрацоўніцтва з установамі адукацыі г. Іўе, аддзелам рамёстваў і традыцыйнай культуры Іўеўскага цэнтра культуры і вольнага часу.

У 2022 г. работнікамі бібліятэкі быў распрацаваны і праведзены цыкл «урокаў малявання» «Мы малюем Беларусь».

На працягу года пры дапамозе «палітры фарбаў» супрацоўнікі Іўеўскай раённай бібліятэкі разам з вучнямі 5–6 «В» класаў Іўеўскай сярэдняй школы стваралі каляровы вобраз нашай краіны.

Першае мерапрыемства ў межах праекта – «урок малявання» «Ясная, светлая, чыстая, пяшчотная, белая – Беларусь!» – было прысвечана беламу колеру. Чаму белы колер у беларусаў у пашане? Над гэтым пытаннем спрабавалі разважаць хлопчыкі і дзяўчынкі падчас мерапрыемства.

Чарговыя «ўрокі малявання» блакітным і зялёным колерамі («Беларусь з блакітнымі вачыма», «Адчыні таямніцы роднага краю») былі прысвечаны нацыянальнаму багаццю Беларусі: рэкам і азёрам, лясам і палям, жывёльнаму і расліннаму свету, дзяржаўным запаведнікам і заказнікам. У ходзе мерапрыемстваў вучні таксама пазнаёміліся з прыроднымі багаццямі Іўеўскага краю.

На жаль, у гісторыі нашай Радзімы ёсць і драматычныя, «чорныя» старонкі». У ходзе «ўрока малявання» «Я родам не з дзяцінства – з вайны» дзеці разам з бібліятэкарам «малявалі» чорным колерам трагічныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Размова ішла пра лёсы дзяцей ваеннай пары, гісторыю стварэння Іўеўскага сіроцкага дзіцячага дома.



Творчая майстэрня «Ганаруся табой, Беларусь».
Фота А. Віктаравай

Падчас краязнаўчага падарожжа «Край свой родны абыду, скарбы розныя знайду», якое было прысвечана жоўтаму колеру, удзельнікі мерапрыемства звярнулі асаблівую ўвагу на саломку – «беларускае золата».

Чырвоны колер – колер гонару і пашаны, а беларускаму народу ёсць чым ганарыцца! Чарговы «ўрок малявання» пад назвай «Займай, Беларусь маладая мая, свой пачэсны пасад між народамі!» быў прысвечаны знакамітым людзям, мясцінам, падзеям нашай краіны і Іўеўшчыны. Напрыканцы мерапрыемства дзецям з дапамогай картак з QR-кодамі было прапанавана павандраваць па родным горадзе. Падчас падарожжа яны па-новаму адкрылі для сябе звыклыя мясціны, міма якіх праходзілі кожны дзень, даведаліся малавядомыя факты пра г. Іўе.

Завяршыўся цыкл «Мы малюем Беларусь» выніковым мерапрыемствам пад назвай «Ганаруся табой, Беларусь!».

Матэрыялы праекта «Беларускі чацвер. Мы малюем Беларусь!» (сцэнарыі мерапрыемстваў, фотаздымкі, відэазапісы, рэкамендацыйныя спісы літаратуры і г. д.) сталі асновай для стварэння аднайменнага электроннага інфармацыйнага рэсурсу на сайце ДУК «Іўеўская раённая бібліятэка» (доступ па спасылцы: https://ivjebiblioteka.wixsite.com/website-1). Гэта метадычны дапаможнік для ўсіх, хто жадае выкарыстаць вопыт работы бібліятэкі ў рэалізацыі дадзенага праекта.


Культурны мост «Гісторыя дзвюх краін – гісторыя двух гарадоў». Фота А. Віктаравай

У 2023 г. у межах праекта «Беларускі чацвер» быў праведзены цыкл мерапрыемстваў «НеВядомая беларуская літаратура» з мэтай папулярызацыі нацыянальнай літаратуры, раскрыцця яе «таямніц і загадак», знаёмства з цікавымі фактамі з жыцця і творчасці беларускіх аўтараў.

У выніку рэалізацыі праекта распрацаваны і праведзены мерапрыемствы: кніжны куфар «Свет загадак і міфаў» (па творах Я. Баршчэўскага «Вужыная карона» і М. Багдановіча «Вадзянік»), бібліякарта «Покліч мінулых стагоддзяў» (па творах У. Бутрамеева «Славутая дачка Полацкай зямлі», П. Броўкі «Яшчэ ў дні старыя, у век наш лучынны» і інш.), літаратурны альманах «Чарадзейная сіла мастацтва» і інш. Да кожнага мерапрыемства былі створаны дадатковыя матэрыялы: анлайн-крыжаванкі, віртуальныя віктарыны, інтэрактыўныя гульні і інш.

Завяршыўся цыкл мерапрыемстваў «НеВядомая беларуская літаратура» раённым конкурсам чытальнікаў беларускай паэзіі «Паэтычны зоркапад».

На падставе матэрыялаў праекта супрацоўнікамі Іўеўскай раённай бібліятэкі быў створаны электронны інфармацыйны рэсурс «Беларускі чацвер. НеВядомая беларуская літаратура» і размешчаны на сайце ДУК «Іўеўская раённая бібліятэка» (доступ па спасылцы: https://ivjebiblioteka.simdif.com/).

У межах праекта «Беларускі чацвер» ДУК «Іўеўская раённая бібліятэка» прыняла ўдзел:

у абласных акцыях, конкурсах, чэленджах: «Класічна. Патрыятычна»: Гродзеншчына чытае Янку Купалу і Якуба Коласа»; «Бібліятэка.by»; «Мы – Беларусы!» (віртуальнае відэазнаёмства са шматнацыянальнай Іўеўшчынай): https://www.youtube.com/watch?v=buvCfLcesWE&list=PLuenDeGCLqbZB2dEFsRSb0moLOILiflkF&index=2&t=28s;

у міжнароднай акцыі «Чытаем беларускую кнігу» (арганізатар Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк г. Мінска);

у сеткавай акцыі-чэленджы па стварэнні буклукаў (booklook) «Мая беларуская дзіцячая кніга» (па кнізе Н. Галіноўскай «У казачным лесе»);

у дзіцячым конкурсе выканальнікаў беларускай казкі (у межах III Міжнароднага форума даследчыкаў беларускай казкі, які арганізоўвала Нацыянальная акадэмія навук Беларусі): https://www.youtube.com/watch?v=JLh3klWquAQ&list=PLuenDeGCLqbZB2dEFsRSb0moLOILiflkF&index=1&t=45s.

Але асноўным станоўчым вынікам рэалізацыі праекта для супрацоўнікаў Іўеўскай раённай бібліятэкі стала сапраўдная цікавасць да пазнання Радзімы і жывыя эмоцыі непасрэдных удзельнікаў – дзяцей і падлеткаў.

Дзейнасць бібліятэкі па папулярызацыі беларускай літаратуры, мовы, гісторыі і культуры беларускага народа з’яўляецца трывалым падмуркам для грамадзянска-патрыятычнага і духоўна-маральнага выхавання падрастаючага пакалення, прымушае задумацца аб мінулым і сучаснасці праз пазнанне непарыўнай сувязі з папярэднімі пакаленнямі.

У гэтым годзе Іўеўская раённая бібліятэка распачала разам з вучнямі 6 «В» класа гімназіі № 1 г. Іўе працаваць над новым творчым грамадска-патрыятычным праектам «КЛАСныя сустрэчы ў бібліятэцы».

З чаго пачынаецца любоў да Радзімы? Напэўна, з роднай мовы, таму першы наш урок беларусазнаўства «Беларусь ад А да Я» быў прысвечаны нашай краіне. Бібліятэкарамі

была падрыхтавана незвычайная кветка, у якой пад кожным пялёсткам былі заданні. Вучні, адкрываючы пялесткі кветкі, выконвалі іх: былі «перакладчыкамі», разгадвалі рэбусы і загадкі, адказвалі на самыя цікавыя і складаныя пытанні, успаміналі знакамітых людзей нашай краіны і раёна.

Памяць аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца святой для кожнага беларуса, для будучага пакалення. У рамках мерапрыемстваў, прысвечаных Дню Перамогі і 80-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і абласнога марафону «У 44-м прыйшла ў Прынямонне Перамога» ў Іўеўскай раённай бібліятэцы ў маі бягучага года прайшла прэзентацыя брашуры «Памятаць, каб жыць», якая была падрыхтавана і выдадзена супрацоўнікамі рэдакцыі раённай газеты «Іўеўскі край». У брашуры сабраны матэрыялы аб генацыдзе насельніцтва Іўеўскага раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны, якія публікаваліся на старонках газеты ў рамках праекта «Памятаць, каб жыць» на працягу 2022–2023 гг.

Многія матэрыялы для артыкулаў былі прадастаўлены пракуратурай Іўеўскага раёна, важныя звесткі былі знойдзены ў выніку карпатлівай працы мясцовых краязнаўцаў Алега Ігліцкага, Андрэя Ваўчка, Марыны Пазняк і загадчыцы аддзела абслугоўвання Іўеўскай раённай бібліятэкі Таісы Грыкень.

У Іўеўскай раённай бібліятэцы надаецца асаблівая ўвага правядзенню мерапрыемстваў, прысвечаных знакавым для Беларусі датам і падзеям: Году якасці, Году міру і стварэння, Дню Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Дню яднання народаў Беларусі і Расіі, Дню Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь, Дню Перамогі, Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, Дню народнага адзінства і інш.

Так, напрыклад, да Дня яднання народаў Беларусі і Расіі ў 2023 г. на базе Іўеўскай раённай бібліятэкі адбыўся культурны мост «Гісторыя дзвюх краін – гісторыя двух гарадоў» (анлайн-сустрэча з горадам-пабрацімам Мінусінскам).

З мэтай прасоўвання кнігі і чытання, папулярызацыі кніжнага фонду бібліятэкі ў 2024 г. рэалізоўваюцца праекты «Фотапартрэт кнігі» (да 2024 г. – «BookLook»), «Сям'я і кніга: чытаем разам» (да 2024 г. – «Да кнігі і чытання праз сям'ю і зносіны»), творчы выставачны праект «Бібліятэка за шклом» і інш.

У ліпені 2023 г. у Іўеўскай раённай бібліятэцы стартаваў праект «PRO-чтение» (у 2024 г. працягвае сваю работу), які рэалізуецца сумесна з рэдакцыяй газеты «Іўеўскі край».

Праект накіраваны на прасоўванне кнігі і чытання, павышэнне інфармацыйнай культуры чытачоў, знаёмства з дзейнасцю бібліятэкі. На старонках газеты ў рамках праекта публікуюцца навіны з жыцця публічных бібліятэк раёна і агляды самых папулярных сярод чытачоў кніг у рубрыцы «Раім прачытаць» (#ТОП-5 кніг месяца).

Жыццё нашай бібліятэкі ніколі не стаіць на месцы. З дапамогай кнігі, мерапрыемстваў, якія праводзяцца, бібліятэкары імкнуцца ўзбагаціць наведвальнікаў цікавай і карыснай інфармацыяй, дапамагчы стаць больш духоўна багатымі, добрымі, міласэрнымі.

Змяняецца час, мяняемся мы і толькі адно застаецца нязменным – гэта добразычлівая, творчая атмасфера ў нашай бібліятэцы, жаданне зрабіць сваю работу як мага лепшай і якаснейшай, прымяняць усё новае, сучаснае, развівацца, увасабляць у жыццё свае задумы і праекты.

Вельмі шкада, што сёння сучасныя тэхналогіі пацяснілі кнігу і яна апынулася крыху ўбаку. Вядома ж, што праз Інтэрнэт можна знайсці шмат інфармацыі і вельмі хутка. Але кніга – гэта ўнікальная з'ява. І хочацца, каб людзі гэта разумелі, каб ім дастаўляла задавальненне патрымаць кнігу ў руках, каб паводле тэорыі аб тым, што ўсё развіваецца па спіралі, па спіралі б вярнулася і любоў да кнігі. І тады ўсім песімістам, якія лічаць, што бібліятэк хутка не стане, мы зможам адказаць цытатай А.І. Герцэна: «Усё жыццё чалавецтва паслядоўна асядала ў кнізе: плямёны, людзі, дзяржавы знікалі, а кніга заставалася».

Захоўваючы лепшыя традыцыі, калектыў Іўеўскай раённай бібліятэкі шукае новыя падыходы, формы работы, імкнецца выкарыстоўваць бібліятэчны патэнцыял з мэтай выхавання адукаваных, духоўна багатых асоб, патрыётаў Беларусі.

Summary

The article presents the activities of the Ivye regional library in the patriotic education of users.

Татьяна Забияко

Светлана Курашова



# ГОМЕЛЬСКИЙ ПОЛК НАРОДНОГО ОПОЛЧЕНИЯ: ИСТОРИЯ, ПОДВИГ, ПАМЯТЬ



**Директор Гомельской областной универсальной библиотеки им. В.И. Ленина**

**Ученый секретарь Гомельской областной универсальной библиотеки им. В.И. Ленина**

Большая роль в увековечении священной памяти о героических и трагических событиях Великой Отечественной войны отводится публичным библиотекам. Эта систематическая и кропотливая работа на протяжении многих лет ведется и в Гомельской областной библиотеке. Она находит свое отражение в многочисленных мероприятиях, акциях, встречах. Особое место среди них занимают масштабные проекты, подготовленные на основе большой поисково-исследовательской работы, а их презентация включает элементы театрализации, тематические вокальные номера и экскурсионное сопровождение.

Одним из таких проектов является «Гомельский полк народного ополчения: история, подвиг, память», который был презентован в Гомельской областной библиотеке накануне 80-летия освобождения города от немецко-фашистских захватчиков.












Презентация проекта «Гомельский полк народного ополчения: история, подвиг, память» в Гомельской библиотеке. Фото С. Курашовой

Героическая оборона Гомеля легендарной страницей вошла в его историю. Полк народного ополчения храбро держал ее 7 дней: с 13 августа до конца дня 19 августа 1941 г., мужественно защищая подступы к городу и прикрывая отход на восток отдельных частей и подразделений советских войск, способствуя сохранению их боеспособности.

Кто эти герои, добровольно, по зову сердца, вставшие на защиту родного города? О мужестве и патриотизме жителей Гомеля рассказывает выставочный проект, повествующий об истории создания, деятельности, организаторах и участниках Гомельского полка народного ополчения в первые месяцы Великой Отечественной войны.

В результате работы над проектом было исследовано более сотни архивных документов, проанализированы материалы областной конференции, воспоминания участников борьбы против немецко-фашистских оккупантов, документально-исторические очерки, газеты республиканского, областного и районного уровней.

Национальный архив Республики Беларусь предоставил приказы, рапорты о выполненных заданиях, сведения о боевом и численном составе полка, боевой и политической подготовке, дислокации постов по охране объектов Гомеля, схемы предполагаемой обороны, списки личного состава батальонов и другие материалы.

Из фондов Государственного архива общественных объединений Гомельской области были использованы протоколы заседаний бюро Гомельского обкома и горкома Коммунистической партии большевиков





Белоруссии, личные дела, воспоминания, фотографии организаторов и участников Гомельского полка народного ополчения.

Специалистами Гомельской областной библиотеки была проделана большая работа по сбору и систематизации материала. Источники информации, изученные библиотекарями-краеведами во время подготовки проекта, в значительной степени посвящены защите Гомеля, участию полка народного ополчения в создании оборонительных сооружений и укреплений на подступах к городу, эвакуации на восток оборудования фабрик и заводов.

Обширный фонд периодических изданий с глубокой ретроспективой хранения помог составить объективную картину первых дней войны, опираясь на достоверные источники. Статьи, опубликованные в разные годы на страницах газет, сыграли важную роль при уточнении даты образования Гомельского полка народного ополчения, мест захоронений и перезахоронений ополченцев, увековечении их памяти.

Большой ценностью являются книги с автографами авторов – бойцов полка народного ополчения Гомеля, которые находятся в фонде областной библиотеки. Уникальные дарственные надписи на изданиях – это проводники в героическую историю нашей страны.

Роллапы и баннеры-персоналий окрашены в песочный цвет, напоминая о выжженной солнцем и огнем августовской земле, когда в тяжелых сражениях ополченцы сдерживали врага. Буквы названия проекта на основном баннере в красно-оранжевом цвете, который отсылает воображение к пожарищам, полыхавшим на многострадальной белорусской земле. Дизайн, вдохновленный историей, подвигами и мужеством наших соотечественников, позволил передать атмосферу сражений, героизма тех, кто отдал свою жизнь за Родину.

Гости презентации проекта погружаются в трагические события истории города благодаря постановкам в исполнении актеров народного любительского театра «Грачи» – единственного в нашей стране библиотечного театрального коллектива со званием «народный».

Сценические миниатюры показывают подготовку Гомеля к обороне и эвакуации предприятий и гражданского населения, объединение молодежи города перед лицом врага.

Лирическим завершением презентации проекта служит песня «Подвиг ополченцев». Произведение композитора Галины Сорочан на стихи Натальи Люлиной о добровольцах-ополченцах, вставших на защиту Ленинграда, было адаптировано для рассказа о подвиге гомельчан.

Широкая рекламная кампания в областных и городских средствах массовой информации обеспечила устойчивый интерес к выставочной экспозиции. За период с 21 ноября 2023 г. по настоящий момент проект посетители 2547 человек. Среди них – руководство Гомельской области, учащиеся школ и средних специальных учебных заведений, студенты, читатели и гости областной библиотеки. Помимо экскурсий, за это время прошло 12 полномасштабных презентаций проекта, большинство из которых состоялось вне стен областной библиотеки: Гомельском государственном университете им. Франциска Скорины, Гомельском государственном техническом университете им. П. Сухого, Лоевской центральной районной библиотеке, Буда-Кошелевской картинной галерее им. Е. Моисеенко, исправительной колонии № 4 г. Гомеля и т. д. Выставочный проект с нетерпением ждут во многих учреждениях и организациях Гомельской области.

Подобного рода проекты, подготовленные на основе большой поисково-исследовательской работы и презентованные в виде особого театрально-концертного действа, способствуют патриотическому воспитанию подрастающего поколения, привлекают внимание общественности к работе библиотек по сохранению исторической правды о Великой Отечественной войне.

Summary

The article presents the project of the Gomel Regional Universal Library named after V.I. Lenin “Gomel People's Militia Regiment: History, Feat, Memory”.

Марина Камлюк

# ЭЛЕКТРОННЫЙ ПРОЕКТ «ЛИСТАЯ ИСТОРИИ СТРАНИЦЫ»



**Заведующий отделом Минской районной центральной библиотеки**

Верность героическим традициям, знание прошлого являются основой системы воспитания любого гражданского общества. Патриотизм – связующая нить разных поколений, и потому библиотека придает особое значение вопросам патриотического воспитания. Минская районная центральная библиотека разработала проект «Листая истории страницы».

Одной из задач проекта является поиск информации о ветеранах фронта и тружениках тыла, погибших земляках, детях войны. Данные находили в различных источниках: обращались к книге «Памяць», запрашивали информацию у сельских исполнительных комитетов, использовали материалы, собранные библиотеками, обращались к помощи краеведов-любителей, находили документы в архивах и др.

Благодаря оцифрованным электронным архивам стало доступно получать документы из архивов Республики Беларусь и Российской Федерации.

Находили потомков, которые с удовольствием предоставляли сохранившиеся документы и делились воспоминаниями о своих погибших родственниках. Документы, которые приносили, оцифровывались, ламинировались (для сохранности) и возвращались родственникам.

Электронный ресурс содержит информацию более чем о 500 ветеранах фронта, тружениках тыла, погибших земляках. Выпущено и размещено в сети Интернет более 200 листовок и 80 буклетов «Их имена навечно в памяти односельчан».

Информация по сбору данного ресурса размещается в Интернете, на информационных стендах библиотек, выездных выставках, широко используется на мероприятиях. Действует обратная связь. Люди часто связываются с библиотекой с целью поделиться данными о своих родственниках. Иногда звонят или пишут, чтобы поблагодарить за найденную информацию (были случаи, когда люди считали, что их родные пропали без вести, а благодаря нашему ресурсу находили данные о их боевом пути и месте захоронения).

Кроме электронного раздела «Им надо поклониться до земли» в рамках патриотического проекта с целью большей вовлеченности и заинтересованности населения были разработаны и размещены следующие электронные разделы:

буктрейлеры «Эхо войны и память сердца», с записью детей Минского района;

виртуальные выставки «Равнение на Победу»;

видеоролики стихов о войне с участием детей «Там, на войне», для которых ребята целенаправленно готовились: выбирали стихи, учили, подбирали костюмы для съемок;

интернет-ролики песен «Песни памяти».

Для детей и молодежи был организован видеокурс «Я – режиссер», где ребята могли побыть на месте режиссера и сценариста, учились сами монтировать видео при помощи специалистов библиотеки в программе Movie Maker.

У председателя Минской районной организации ветеранов Н. Карнишко библиотекой были запрошены краеведческие материалы (газетные статьи) о ветеранах Минского района. Документы были оцифрованы и систематизированы в электронный ресурс газетных статей. Они заняли достойное место в фонде краеведческих документов районной библиотеки.

Сегодня в стране около 9 тыс. памятников и захоронений Великой Отечественной войны. К сожалению, трудно найти информацию о некоторых памятниках, узнать историю, которая предшествовала их установки. С этой целью был разработан информационный ресурс по местам воинской славы Минского района «Памятники вечной славы», в 2023 г. разместили информацию более чем о 40 памятниках.

В Минском районе немецко-фашистскими захватчиками и их пособниками было сожжено более 100 деревень, 6 из которых не восстановлены, погибло более 2200 мирных граждан, более 1300 человек угнано.

С целью сохранения информации о сожженных деревнях Минского района был создан информационный ресурс «Дорогами сожженных деревень». На данный момент собрана и размещена информация о следующих уничтоженных деревнях: Агарки, Камки, Бахметовка, Кузьменка и Вышково. Открыта стена памяти «Забывший прошлое, обречен пережить его заново», на которой размещена информация о лагерях смерти на территории Минского района и карта сожженных деревень. По представленным QR-кодам можно перейти в базы данных памятников боевой славы Минского района.

Минская районная центральная библиотека активно использует в своей работе информационные технологии и игровые формы, что дает возможность читателям с легкостью запоминать информационный материал и проникнуться атмосферой героического прошлого своего народа. С этой целью была создана и размещена на сайте библиотеки игротека «По следам великого мужества» с интерактивными играми: «О войне расскажут ордена», где пользователю предлагается соединить изображение государственных наград СССР с их названиями; «Медали Великой Отечественной войны» – позволяет читателям более глубоко познакомиться с наградами и их статусом; «Чистое небо», в которой пользователь имеет возможность познакомиться с летчиками – Героями Советского Союза.

Для большего вовлечения общественности в патриотический проект и популяризации бережного отношения к своему героическому прошлому разработаны стикерпаки «С Днем Победы!» и «Герои Минского района» в мессенджере Viber, которые стали частью ежедневного общения, яркие наклейки и емкие высказывания позволяют напомнить о великих достижениях прошлого и прививать гордость за свою Родину.

Большой интерес среди интернет-пользователей вызвал цикл онлайн-фактов истории «Колокола Памяти», где размещена познавательная информация о значимых событиях, которые произошли в конкретный день.

Для закрепления и проверки информации для пользователей социальных сетей созданы онлайн-тесты «По страницам истории».

На сайте библиотеки и в социальных сетях была размещена преамбула мнений в GIF-анимации «Нам жить – нам выбирать» к республиканскому референдуму, где пользователям было предложено поэтапно разобраться в изменениях и дополнениях, вносимых в Конституцию Республики Беларусь.

С целью идеологического и патриотического воспитания, распространения и популяризации собранного краеведческого материала, сохранения исторической памяти народа в Великой Отечественной войне, возрождения славы Советской армии, формирования положительного образа героев войны, нравственных идеалов и ценностей Минской районной центральной библиотекой проводились различные библиотечные мероприятия и информационная работа.


Патриотическая акция «Трагедия непокоренной Беларуси». Фото М. Камлюк

Минская районная центральная библиотека приняла участие в торжественной церемонии открытия таблички с размещенным QR-кодом у братской могилы в аг. Михановичи. По этому коду можно узнать информацию о погибших и захороненных. Информация собрана работниками библиотеки и размещается на странице информационного ресурса

с фамилиями 44 известных воинов из 114 захороненных героев.

В преддверии Великой Победы библиотека начала цикл мероприятий для военнослужащих в/ч 30151, посвященных событиям этого периода. Так, прошла международная акция памяти «Во славу общей Победы». На митинге-реквиеме возле братской могилы в аг. Гатово собрались представители Новодворского сельисполкома, Минского государственного лингвистического университета, ГУ «Минская районная центральная библиотека», в/ч 30151, Гатовской средней школы и общественных организаций «Белая Русь» и БРСМ.

Совместно с Михановичским центром культуры проведены конкурсы чтецов, посвященные празднованию Победы в Великой Отечественной войне «Мы о войне стихами говорим».

Оформлена интерактивная экспозиция «Мой родны кут, цябе я ўслаўляю». Один из разделов посвящен ветеранам Великой Отечественной войны «Подзвігам славутыя твае землякі» с QR-кодом, который состоит из двух частей: «Герои Советского Союза, которые родились и (или) проживали на территории Минского района»; «Истории о ветеранах фронта, тружениках тыла, погибших земляках, детях войны».

Минская районная центральная библиотека неоднократно принимала участие в акциях на Кургане Славы.

В преддверии Дня Всенародной памяти жертв Великой Отечественной войны и геноцида белорусского народа в аг. Михановичи проходила патриотическая акция «Трагедия непокоренной Беларуси». Акция завершилась 30 июня автопробегом по местам боевой славы и доблести Михановичского сельского совета. Были посещены пять памятников и мест захоронения. Записаны и размещены видеообращения к соотечественникам от известных людей района: председателя Михановичского сельсовета, военнослужащих части № 30151, людей, которые взяли шефство над памятниками, ветерана афганской войны, председателя молодежного парламента, руководителей учреждений культуры.

На сайте библиотеки и в социальных сетях были размещены буктрейлеры по книге «Геноцид белорусского народа». Главы книги были озвучены силами читателей.

Одной из тем ток-шоу «Дороги, которые мы выбираем» стало патриотическое воспитание в современном обществе. Почетными гостями выступили эксперты: председатель Михановичского сельисполкома С. Довальцова, настоятель храма Димитрия Ростовского Д. Гриценко, а также командир дивизиона № 30151 майор А. Долбик.

Сотрудники библиотеки поучаствовали в IX Международном конгрессе «Библиотека как феномен культуры» в Национальной библиотеке Беларуси с темой «Патриотическое воспитание в онлайн-формате».

Поучаствовали в автограф-форуме «На хвалі часу» с руководством и работниками издательского дома «Беларусь сегодня».

Совместно с Молодежным парламентом при Минском районном Совете депутатов в 2023 г. создана «Школа идеолога» с целью проведения мероприятий с молодежью, направленных на формирование целостной, политически грамотной, участвующей в социальной жизни общества личности. В ее рамках прошло множество разноплановых мероприятий.

В феврале 2023 г. состоялась патриотическая встреча с Алексеем Талаем, членом Национальной параолимпийской сборной, мотивационным спикером, благотворителем и членом Конституционной комиссии.

Побывали на экскурсии по Дому Правительства Республики Беларусь, которую

QR-коды:

База данных «Им надо поклониться до земли»

Информационный ресурс «Памятники вечной славы»

Информационный ресурс «Дорогами сожженных деревень»

проводил начальник отдела по подготовке законопроектов и взаимодействию с Постоянной комиссией по образованию и науке Гамезо Валерий Валерьянович.

Ко Дню Независимости Республики Беларусь по инициативе председателя Молодежного парламента Минского района Минская районная центральная библиотека приняла участие в записи поздравительного клипа «Хата бацькоў» с солистом группы «Дрозды» Виталием Карпановым.

Минская районная центральная библиотека приняла участие в совместном проекте СТВ и Молодежного парламента при Национальном собрании Республики Беларусь в молодежном идеологическом ток-шоу на РТР-Беларусь «Да! Но…» с Евгением Пустовым и Григорием Азаренком.

Сотрудники библиотеки поучаствовали в международном проекте «Капсула Победы».

Проводимые библиотекой мероприятия транслируются в TikTok, на YouTube-канале и в социальных сетях.

Summary

The article presents the project of the Minsk Regional Central Library “Turning Through the Pages of History”.






19 апреля 2024 г. в библиотеках Беларуси в шестой раз состоялась культурно-просветительская акция «Библионочь-2024» – событие, ставшее замечательной традицией для всего читающего сообщества. В честь Всемирного дня книги и авторского права ежегодно библиотеки расширяют время и формат своей работы. 10 городов, 15 библиотек и более сотни интереснейших событий. Насыщенная и масштабная программа акции – это множество тематических площадок на любой вкус и возраст: лекции, мастер-классы, экскурсии, творческие встречи, игры для детей и взрослых и другие познавательные мероприятия. Вкратце расскажем, как это было.

### г. МИНСК

***Национальная библиотека Беларуси***

*Тема: «NLB. Планета знаний».* Главная библиотека страны пригласила друзей быть в центре притяжения. В программе – активные квесты, шахматно-шашечные турниры, настолки от «HobbyGame», «этна-вечарына» с фолк-группой «Guda» и капеллой традиционной музыки «Анягож», показ моделей одежды современных белорусских дизайнеров от модельного агентства «Wow Kids», лекции адвоката, астропсихолога, астролога, стилиста, мастер-классы по технике китайской живописи и графике, бачате и сальсе и др. Для маленьких гостей развернулся «Космический фантазиум» – театр, занимательные мастер-классы, игровая программа.

***Республиканская научная медицинская библиотека***

*Тема: «БиблиоМедика».* Посетители «БиблиоМедики» смогли узнать тайны здоровья, красоты и долголетия, сходили в гости к знахарке и попробовали целебные чаи по старинным рецептам, научились делать удивительные прически и создавать уникальные сувениры, постигли технику японского переплета и загадочное искусство арт-терапии. В программе: эксклюзивные лекции акушера-гинеколога Елены Джамале и врача-педиатра Ольги Кардаш, авторский вечер белорусского писателя и поэта, талантливого врача Натальи Волчок, интерактивная площадка военной медицины времен Великой

Отечественной войны, увлекательный квест в Музее истории медицины Беларуси. Для любителей интеллектуальных игр – «Взрыв мозга», «Мафия», соревнования по разгадыванию кроссвордов и множество настольных игр. Для маленьких посетителей работала детская комната, где юных гостей встречали любимые литературные герои и каждый ребенок нашел себе занятие по душе: бисероплетение, рисование скетчинг-маркерами, лепка из воздушного пластилина и др. Самые активные участники получили приятные сюрпризы.

***Центральная научная библиотека им. Якуба Коласа НАН Беларуси***

*Тема: «#ПРОнауку».* Больших и маленьких исследователей пригласили в лабораторию #ПРОнауку! С помощью экспертов (ученых) здесь можно было узнать о том, как по нескольким костям восстановить размеры, облик и даже цвет динозавров, как выделить ДНК-молекулу в домашних условиях из привычных фруктов. Гостям поведали историю возникновения сыра (она насчитывает больше 5 тыс. лет), познакомили с тонкостями автомобильного дизайна, а также проинформировали о научных заблуждениях и рассказали, что с ними делать. Юных знатоков ждали развлекательные площадки с интеллектуальными играми и квестами, мастер-класс от детского научного клуба «Молекула». Нашлось место и творческой лаборатории. Запечатлеть приятные моменты посетители смогли с помощью профессиональной фотосессии.

***Белорусская сельскохозяйственная библиотека им. И.С. Лупиновича НАН Беларуси***

*Тема: «Вечер. Пятница. Библиотека…».* Гостей ждали творческие мастер-классы, лекции и экскурсии, игры для детей и взрослых, буккроссинг и музыка.

***Центральная библиотека им. Янки Купалы***

*Тема: «Ночь кино в Купаловке».* В год 100-летия белорусского кино библиотека превратилась в огромный кинопавильон. В увлекательной программе: творческие встречи с известными людьми, представляющими киноискусство, необычные киносеансы, живая музыка из любимых фильмов, киноквест, мастер-классы, оригинальная фотозона, сюрпризы и призы.

***Центральная детская библиотека им. Н. Островского.***

*Тема: «Век живи – век читай».* Гостей вечера ждали встречи с детскими писателями Ириной Токаревой, Екатериной Хадасевич-Лисовой, Павлом Гушинцом, а также театрализованные чтения, разнообразные мастер-классы, литературные викторины, зона настольных игр и др. Участники смогли обсудить любимые книги, поделиться литературными впечатлениями, задать вопросы авторам, узнать больше о творческом процессе написания книг и проверить свою эрудицию.

## БРЕСТСКАЯ ОБЛАСТЬ

***Барановичская центральная районная библиотека им. Яна Чечота***

*Тема: «Загляни в 44-й».* Участники мероприятия прошли квест «Загляни в 44-й»: написали письмо освободителю, провели операцию «Поиск», побывали в «Развед-Штабе», совершили «Музыкальный привал», заглянули в «Партизанскую землянку», пересекли «Литературный рубеж», а также отработали приемы первой медицинской помощи в «Медчасти».

***Барановичская центральная городская библиотека им. В. Тавлая***

*Тема: «Библионочь 20:24».* Библиотека организовала увлекательный семейный квиз «Однажды в библиотеке».

## ГРОДНЕНСКАЯ ОБЛАСТЬ

***Вороновская районная библиотека***

*Тема: «БиблиоХаос “Без билета на ночной сеанс”».* В режиме нон-стоп работали многочисленные тематические локации: детективное агентство, библиокафе, литературный салон «Гадания по книгам», разнообразные мастер-классы, литературные викторины, романтическая фотозона, вечерний киносеанс «Приключения Библиотекаря». Гости акции смогли оставить свои пожелания и отзывы, сделать селфи с литературными героями, познакомиться с книжными выставками. Для маленьких читателей была организована детская площадка «Страна чудес», аквагрим, игры, викторины, мультсеанс.

***Ошмянская районная библиотека***

*Тема: «Всей семьей в Книжную галактику».* Участники мероприятия приняли участие в игровой программе, посмотрели

мультфильмы с героями из любимых сказок и познакомились с интересными книжными выставками. Ребята поиграли в настольные и подвижные игры, поучаствовали в мастер-классе по изготовлению книжных закладок. Весь вечер работали фотозона, библиокафе, разыгрывалась лотерея.

***Сморгонская районная библиотека***

*Тема: «Книжная Атмосфера».* В программе мероприятий акции: концерт «Литературное настроение», арт-вернисаж сморгонского художника Евгения Балаша «Краски весны», библиокешинг «Вокруг да около… библиотеки», мастер-классы: аквагрим «Фантазия» и изготовление книжных закладок «Книжный оберег». Для гостей вечера был организован полуночный кофе-брейк перед «Ночью кино».

## МОГИЛЕВСКАЯ ОБЛАСТЬ

***Библиотека-филиал № 9 им. Янки Купалы Централизованной системы государственных публичных библиотек г. Могилева***

*Тема: «Сказочная ночь Янки Купалы».* Программа акции была посвящена известному белорусскому писателю Янке Купале, имя которого носит библиотека. Среди приглашенных гостей – представители Государственного литературного музея Янки Купалы (Минск), могилевские модельеры С. Тимошенко и А. Борисенко, вокальный ансамбль «Вераснёвіца», театр «Атмосфера» и др. Звучала живая музыка, прошел показ модной одежды, демонстрировались народные танцы, блюда белорусской кухни.

***Белыничская центральная районная библиотека***

*Тема: «Библиотечное квест-путешествие в Зазеркалье».* были организованы мастер-класс «Путешествие по Заколдованному лесу», интеллектуальная площадка «БезУМНОЕ чаепитие», где участники проверили свои знания и смекалку, разгадав логические загадки и ребусы, ответив на каверзные вопросы от Черной королевы; работали игровые площадки «Магические развлечения» и «Виртуальная реальность». Завершил программу вечера «Бал у Белой королевы», на котором был проведен беспроигрышный аукцион памятных подарков от сказочной Алисы.

***Дрибинская центральная районная библиотека***

*Тема: «Библионочь-2024».* В программе: выставка-просмотр «Мир книги без границ», музыкально-поэтический батл «Когда строку диктует чувство…», литературная квест-игра «Путешествие по книжному океану», работа BOOK CAFE, мастер-классы «Бумажное кружево» (создание книжных закладок), «Создай сказку своими руками» (лепка сказочных героев из воздушного пластилина), кондитерский мастер-класс и др.

***Климовичская центральная районная библиотека им. И. Пехтерева***

*Тема: «Мы родом из СССР».* В программе: исторический экскурс в СССР, дефиле театров моды, фитнес «Ритмическая гимнастика 90-х», парикмахерская «Лохматые 90-е», выставки советских плакатов, дворовые и настольные игры, фильмы прошлых лет, ретродискотека и настоящий советский буфет.

***Кричевская городская библиотека № 2***

*Тема: «Книга и компания».* Читателей ждала библиотечная акция-приглашение «Заходи! Смотри! Читай!» с вручением памятных флаеров, книжная выставка «Нас всех объединяет книга», игровая программа «Сказка за сказкой», литературная лотерея «Заморочки из бочки», кукольный спектакль «Случай в лесу», мастер-класс «Рисование воздушными шариками».

*Материал предоставлен отделом связей с общественностью Национальной библиотеки Беларуси:*

*https://www.nlb.by/content/news/national-library-of-belarus/biblionoch-2024-obyavleny-programmy/*

Святлана Афанасьева



# ІНАВАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК СМАРГОНШЧЫНЫ ПА ЗАХАВАННІ ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ

**Дырэктар Смаргонскай раённай бібліятэкі**

У сучасных умовах у дзейнасці Смаргонскай раённай бібліятэкі галоўнымі напрамкамі работы з карыстальнікамі з'яўляюцца інавацыі і патрыятычнае выхаванне насельніцтва. На наш погляд, асноўным у патрыятычным выхаванні з'яўляецца краязнаўства. Работа па краязнаўстве садзейнічае развіццю і станаўленню асобы, выхоўвае грамадзяніна.

У 2023 г. філіял «Сасноўская сельская бібліятэка-клуб» прыняў удзел у XXXI Рэспубліканскім конкурсе «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» ў намінацыі «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы» з работай «Кола гісторыі, ці Вандроўкі па родным краі», атрымаў дыплом I ступені і прэмію ў памеры 50 базавых велічынь.

Філіял «Гарадская бібліятэка № 1» прыняў удзел у Рэспубліканскім конкурсе «Бібліятэка – цэнтр духоўнай асветы і выхавання» ў намінацыі «Патрыятычнае выхаванне на праваслаўных традыцыях» і заняў II месца; у абласным конкурсе «Бібліятэка.by» ў намінацыі «Лепшы інфармацыйна-забаўляльны рэсурс» з краязнаўчым анлайн-квестам «Сцежкамі Смаргоншчыны», атрымаў дыплом II ступені.

Смаргонская раённая бібліятэка прыняла ўдзел у II Рэспубліканскім конкурсе «Лепшы публічны цэнтр прававой інфармацыі» ў намінацыі «Лепшы ПЦПІ цэнтральнай раённай (гарадской) бібліятэкі».

У 2023 г. супрацоўнікі філіяла «Гарадская бібліятэка №3» вырашылі праводзіць мэтанакіраваную краязнаўчую работу па зборы гістарычных фактаў генацыду на тэрыторыі Смаргоні і Смаргонскага раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны і выкарыстоўваць сабраны матэрыял пры правядзенні бібліятэчных мерапрыемстваў для розных груп карыстальнікаў. На падставе сабраных гістарычных фактаў была




Інтэрактыўна-інфармацыйная карта «Без тэрміну даўнасці. Смаргоншчына». Скрыншот з сайта бібліятэкі

распрацавана інтэрактыўна-інфармацыйная карта «Без тэрміну даўнасці. Смаргоншчына», асноўнымі мэтамі якой з'яўляецца фарміранне патрыятычных пачуццяў да роднага краю і развіццё нацыянальнай свядомасці. Рэсурс быў папулярызаваны на працягу 2023 г. на 18 бібліятэчных мерапрыемствах. Інтэрактыўна-інфармацыйная карта размешчана на сайце Смаргонскай раённай бібліятэкі ў раздзеле «Інфармацыйныя рэсурсы» (https://srbsmorgon.by/interactive%20map/map.html). У 2024 г. інтэрактыўна-інфармацыйная карта «Без тэрміну даўнасці. Смаргоншчына» была прадстаўлена на XXXII Рэспубліканскім конкурсе «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» ў намінацыі «За пошукавую і даследчую працу».

У 2024 г. Рэспубліка Беларусь святкуе 80-годдзе вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Абавязак бібліятэкі заключаецца ў захаванні гістарычнай памяці пра Вялікую Перамогу. Смаргонская раённая бібліятэка распрацавала патрыятычны праект «РЭХА: Эпоха, Хронікі, Асобы», які дазволіць стаць ёй адукацыйным цэнтрам для пашырэння гістарычных ведаў карыстальнікаў і дапаможа сфарміраваць у іх высокую патрыятычную свядомасць. У межах праекта будзе створана база даных «Ветэраны Вялікай Айчыннай вайны Смаргонскага раёна» з мэтай выкарыстання падчас правядзення масавых мерапрыемстваў і праведзены цыкл выязных гістарычна-патрыятычных мерапрыемстваў на прадпрыемствы горада.

2024 г. у Рэспубліцы Беларусь аб'яўлены Годам якасці. Бібліятэкі-філіялы дзяржаўнай установы культуры «Смаргонская раённая бібліятэка» не спыняюцца на дасягнутым і імкнуцца да якаснага абслугоўвання наведвальнікаў, укараняюць інавацыйныя формы бібліятэчнай работы, якія дазваляюць ахапіць розныя ўзроставыя групы карыстальнікаў, аб'яднаць намаганні розных арганізацый і ўстаноў, абудзіць цікавасць да гістарычнага мінулага ў кантэксце сучаснасці.

Summary

The article presents the innovative activities of the Smorgon' regional library for the preservation of historical memory.

**Ганна Сіманенка**



**Намеснік дырэктара Гродзенскага раённага культурна-інфармацыйнага цэнтра**

# АДЭЛЬСК – МЯСТЭЧКА, ЯКОЕ БЫЛО ГОРАДАМ

Для кожнага чалавека яго малая радзіма – пачатак вялікай Айчыны. Своеасаблівая прыгажосць родных мясцін, легенды былых часоў, родныя людзі – вось невычэрпная крыніца жыццялюбства, трывалая апора ў сучаснасці і ўпэўненасць у будучыні. Менавіта з любві да малой радзімы, яе гісторыі прабіваюцца парасткі сапраўднага патрыятызму.

Пачуццё дачынення да лёсу роднага краю не ўзнікае само па сабе, а выхоўваецца. Веды аб ім, развіццё цікавасці да мінулага з'яўляюцца перадумовамі да далейшага ўсведамлення сваёй Радзімы, яе гісторыі і культуры.

Бібліятэкар Адэльскай сельскай бібліятэкі – цэнтра краязнаўства і турызму Станіслава Зянонаўна Сідлярэвіч нарадзілася і жыве ў Адэльску, працуе ў бібліятэцы амаль 30 гадоў. Яна любіць сваю малую радзіму і вельмі хоча, каб такія пачуцці былі ва ўсіх аднавяскоўцаў і гасцей аграгарадка. А каб любіць – трэба добра ведаць. Таму адным з прыярытэтных кірункаў Адэльскай сельскай бібліятэкі, якой у 2015 г. быў нададзены статус цэнтра краязнаўства і турызму, з'яўляецца краязнаўчая работа.

Менавіта Адэльская сельская бібліятэка ў Гродзенскім раёне выступіла ў ролі інфармацыйнага партнёра турыстычных структур, стварыўшы камфортнае інфармацыйнае асяроддзе з разнастайнымі краязнаўчымі матэрыяламі і здабыткамі для вырабу



Віртуальная інтэрактыўная карта «Мястэчка, якое было горадам. Падарожжа па аграгарадку Адэльск». Скрыншот з інфармацыйнага рэсурсу бібліятэкі

буклетаў, правядзення праграм, экскурсій. Бібліятэка папулярызуе турыстычны імідж мясцовасці, забяспечвае доступ да інфармацыйных рэсурсаў з выкарыстаннем традыцыйных і найноўшых бібліятэчна-інфармацыйных тэхналогій.

На працягу 2022–2023 гг. Адэльская сельская бібліятэка працуе ў межах праекта «Ад вытокаў у будучыню», які накіраваны на пошук і ўкараненне новых нетрадыцыйных форм работы ў бібліятэчнае краязнаўства, выкарыстанне сучасных лічбавых тэхналогій, накіраваных на пашырэнне турыстычнай прывабнасці мясцовасці, вывучэнне і захаванне гісторыі і культуры малой радзімы, адраджэнне народных традыцый. Праведзена вялікая работа па зборы і афармленні краязнаўчага матэрыялу.

На падставе сфарміраванай рэсурснай базы вядучае месца аддаецца культурна-пазнавальнаму турызму. Распрацаваны пешыя гід-падарожжы «Мястэчка, якое было горадам», «Цікавы музей – музей Скрамблевіча», «Край млыноў і прыдарожных крыжоў» і экскурсійна-турыстычны маршрут «Спадчына зямлі Адэльскай», якія карыстаюцца вялікім попытам сярод шматлікіх гасцей Адэльска: вучняў, турыстаў з Беларусі і бліжняга замежжа.

Развіццё лічбавых тэхналогій дазволіла Адэльскай сельскай бібліятэцы размясціць на сайце інфармацыйна-бібліятэчнага аддзела Гродзенскага раённага культурна-інфармацыйнага цэнтра ўнікальную інтэрактыўную карту «Мястэчка, якое было горадам. Падарожжа па аграгарадку Адэльск» (https://rcbs.by/infarmatsyjnyya-resursy/krayaznaustva/адэльск/). Наведвальнікі інфармацыйнага рэсурсу могуць здзейсніць падарожжа па аграгарадку, не выходзячы са свайго дому. Ім патрэбна толькі выбраць на карце месца, і адкрыецца неабходная інфармацыя са спасылкамі і фотаздымкамі. Пры дапамозе віртуальнай карты можна пазнаёміцца з гісторыяй населенага пункта ад яго першага ўспаміну да сённяшніх дзён, з ваеннымі дзеяннямі ў аграгарадку і яго ваколіцах, з драўляным цудам Адэльска – касцёлам Ушэсця Найсвяцейшай Дзевы Марыі, з уладальнікам статусу народнага майстра Рэспублікі Беларусь, ганаровым грамадзянінам Гродзенскага раёна Мар'янам Антонавічам Скрамблевічам, з гонарам адэльскай зямлі – падвойнымі дыванамі, а таксама даведацца, чаму горад называюць краем ветракоў.

Карта складаецца з сямі раздзелаў, якія дапоўнены фактаграфічнай базай даных.

Раздзел «З гісторыі зямлі Адэльскай» знаёміць з гістарычнымі падзеямі і фактамі пачынаючы з 1940 г. і да нашых дзён, месцазнаходжаннем аграгарадка, гербам і сцягам, эканомікай, тапаніміяй, гідраграфіяй, археалогіяй, этнаграфіяй, геалогіяй і міфалогіяй, а таксама раслінным і жывёльным светам.

У раздзеле «Касцёл Ушэсця Найсвяцейшай Дзевы Марыі» можна даведацца пра Адэльскую парафію, убачыць фотаздымкі з ранейшых дзён святыні, пазнаёміцца з цікавымі звесткамі аб яго заснаванні, а таксама імёнамі ксяндзоў, якія ў ім служылі.



Вятрак у Адэльску. Фота з архіва бібліятэкі

Касцёл Ушэсця Найсвяцейшай Дзевы Марыі ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь. Ён перажыў 13-гадовую вайну з Маскоўскім княствам, Паўночную вайну, Вялікую Айчынную вайну моцныя буры і зараз дзеліцца сакрэтамі народнага драўлянага дойлідства, цудадзейнасцю іконы Святога Антонія, гукам аргана.

Раздзел «Адэльскі маэстра». У кожнай мясцовасці ёсць людзі, якія нечым выдзяляюцца сярод іншых, жывуць такія і ў Адэльску. «Чалавек-аркестр. У яго руках і саломінка зайграе», – так кажуць землякі пра майстра-музыканта, ініцыятара стварэння першага ў Беларусі музея народных інструментаў.

Мар'ян Антонавіч Скрамблевіч – унікальны майстар, які стварае інструменты, здаўна вядомыя ў Беларусі: дудачкі, флейты, жалейкі, акарыны ў выглядзе птушак і рыб, паляўнічыя рогі і трэмбіты. На яго дудачках граюць у Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, ансамблі танца, музыкі і песні «Белыя росы» (Гродна). М. Скрамблевіч мае званне народнага майстра Рэспублікі Беларусь па вырабе народных музычных інструментаў, з'яўляецца членам Беларускага саюза майстроў народнай творчасці. За значны асабісты ўклад



Мар'ян Антонавіч Скрамблевіч – унікальны майстар, які стварае інструменты, здаўна вядомыя ў Беларусі. Фота С. Сідлярэвіч

у захаванне і адраджэнне традыцыйнай народнай культуры, развіццё беларускай народнай творчасці і рамёстваў ён атрымаў Прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва і Грант Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на рэалізацыю праекта па захаванні традыцыйных спосабаў вырабу беларускіх народных інструментаў. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь майстру прысуджаны медаль Францыска Скарыны.

Раздзел «Падвойныя дываны – гонар Адэльскай зямлі» раскрывае яшчэ адзін гонар краю – падвойныя дываны. У ім апісваецца гісторыя ўзнікнення ткацтва, розныя



Падвойныя дываны – гонар Адэльскай зямлі. Фота С. Сідлярэвіч

тэхнікі тканых дываноў і жыццё адной з вядомых беларускіх ткачых Ядвігі Райскай, якая выраблялa дываны на заказ аднавяскоўцам і ўмела ствараць ажно 12 узораў, а іх стылістыка бярэ пачатак ад арнаменту мадэрну пачатку XX ст. На ўсіх яе дыванах ёсць дата вырабу.

Адэльск стаў на Гродзеншчыне адзіным месцам, якое называюць краем вятракоў. Так, у раздзеле «Адэльск – край вятракоў» прадстаўлены гісторыя іх узнікнення, месцазнаходжанне з унікальнымі фотаздымкамі.

Раздзел «Прыдарожныя крыжы» змяшчае цікавы матэрыял пра крыжы-абярэгі Адэльска. Прыдарожныя крыжы – асобная тэма для размовы. У Адэльску іх 10. Крыжы адэльчане шануюць, толькі па дарозе ў Гродна іх стаіць 4. Усе яны або ахвяравальныя, або абярэгі і адносяцца да пачатку XX ст., акрамя аднаго, відавочна, больш даўняга, паходжанне якога дакладна невядома.

Наступны раздзел – «Стравы Адэльскай кухні». У 2016 г. стравы Адэльскай кухні былі занесены ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь. Адэльская традыцыйная кухня ўяўляе сабой комплекс, у склад якога ўваходзяць паўсядзённыя (бабка і кішка бульбяныя, жытні хлеб), святочныя («капытцы», бігас, цымас, сыр клінковы) і абрадавыя стравы (ламанцы).

Час змяняецца, але адным з галоўных кірункаў дзейнасці бібліятэк і сёння застаюцца краязнаўчыя даследаванні, вынікі якіх дапамагаюць выхаванню ў чытачоў пачуцця павагі да роднай мовы, літаратуры, родных мясцін і аднавяскоўцаў, народных свят, абрадаў і звычаяў.

Summary

The article presents an interactive map "The town that was a city. Journey through the agricultural city of Odelsk".

**Валянціна Хархалёва**

# МЫ ГЭТАЙ КРАІНЫ НАШЧАДКІ



**Загадчык
Дзіцячай бібліятэкі № 6
імя М. Астроўскага
Цэнтралізаванай бібліятэчнай
сістэмы г. Бабруйска**

Шмат гадоў Дзіцячая бібліятэка № 6 імя М. Астроўскага Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы г. Бабруйска працуе ў кірунку патрыятычнага выхавання і нацыянальнага адраджэння. Папулярызацыя беларускай мовы і беларускай нацыянальнай культуры – асноўныя напрамкі дзейнасці бібліятэкі. Калі гаворка ідзе аб патрыятызме, то гэта паняцце даволі шырокае, якое ўключае ў сябе любоў да Радзімы, свайго народа, роднай мовы, прыроды роднага краю і культуры, а таксама нацыянальны гонар.

Патрыятычнае выхаванне пранікае ў кожную сферу дзейнасці бібліятэкі: фарміраванне кніжных фондаў, правядзенне бібліятэчных культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў, супрацоўніцтва з іншымі арганізацыямі і ўстановамі.

З 2023 г. Дзіцячая бібліятэка № 6 імя М. Астроўскага працуе над краязнаўчым праектам «Беларусь – мая Радзіма», які накіраваны на выхаванне дзяцей і падлеткаў у духу патрыятызму, далучэнне маладога пакалення да гісторыі, культуры і народных традыцый беларусаў, а таксама прывіццё любові да сваёй краіны і малой радзімы. У дапамогу краязнаўчай дзейнасці пры бібліятэцы з 2005 г. дзейнічае этнагафічная экспазіцыя «Сялянская хата». Экспазіцыя арганізавана з мэтай бліжэй пазнаёміць дзяцей і падлеткаў з народнай культурай беларусаў, з жыццём і побытам нашых продкаў. «Сялянская хата» накіравана на вывучэнне, зберажэнне і перадачу іншым пакаленням беларускіх абрадаў, традыцый, народных свят і папулярызацыю роднай мовы. Тут праходзяць экскурсы ў мінулае, урокі беларускай культуры, прысвечаныя сямейнай абраднасці нашых продкаў.

Работа бібліятэкі па краязнаўстве садейнічае фарміраванню ў дзяцей і падлеткаў нацыянальнай годнасці і патрыятызму, развівае цікавасць да беларускай мовы, творчасці беларускіх пісьменнікаў, паэтаў і народнай культуры Беларусі.

Да Дня Дзяржаўнага герба, Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь з мэтай папулярызацыі сімвалаў беларускай дзяржаўнасці для карыстальнікаў бібліятэкі быў праведзены ўрок грамадзянскасці «Тры галоўныя сімвалы маёй краіны».




Этнаграфічная экспазіцыя «Сялянская хата». Фота В. Хархалёвай




Урок грамадзянскасці «Тры галоўных сімвалы маёй краіны». Фота В. Хархалёвай

У ходзе мерапрыемства дзецям нагадалі аб тым, што ў кожнага народа ёсць свае адметныя знакі, якія перадаюць гісторыка-культурную спадчыну, падкрэсліваюць нацыянальны каларыт і маральныя рысы нацыі.

Пачуццё патрыятызму не можа быць вызначана некалькімі словамі. Гэта і любоў да родных мясцін, і гонар за свой народ, і жаданне захоўваць і ўзбагачаць скарбы сваёй краіны. Радзіма пачынаецца з любові да свайго малога кутка – да роднага горада, дзе дзіця нарадзілася, дзе жывуць яго бацькі, блізкія, сябры. У адзін з цудоўных, сонечных, вясновых дзён вучні малодшых класаў адправіліся ў краязнаўчую экскурсію па горадзе «Бабруйская кругасветка». Падчас займальнай экскурсіі бібліятэкар расказала школьнікам аб знакамітых памятных месцах нашага любімага горада Бабруйска. Таксама на бібліятэчным сайце можна было адказаць на пытанні віктарыны і пазнаёміцца з віртуальнай скарбонкай «Бабраня Форцік пра Бабруйск».

Наш любімы Бабруйск – вялікі, жывы і прыгожы горад. Пра яго можна казаць гадзінамі, бо ён вельмі вядомы сваёй гісторыяй, культурнай спадчынай, знакамітымі людзьмі і прамысловасцю. Бібліятэкары правялі ўрок-падарожжа «Аб той зямлі, дзе ты нарадзіўся». Прыняўшы ўдзел у віктарыне ад бабра Самуілавіча «Люблю Бабруйск, а значыць, ведаю», навучэнцы папоўнілі свае веды аб горадзе, яго славутасцях і ганаровых грамадзянах. Інтэлектуальная гульня «Што, дзе, калі ў Бабруйску?» пазнаёміла дзяцей з цікавай гісторыяй роднага краю, буйнымі прадпрыемствамі і іх прадукцыяй.

На планеце Зямля вельмі шмат краін. Але адна з іх асаблівая. У гэтай краіны прыгожае і светлае імя – Беларусь. Адправіцца ў краязнаўчае падарожжа «Мой край завецца Беларуссю» змаглі маленькія чытачы дзіцячай бібліятэкі № 6 імя М. Астроўскага. Па карце-схеме маршруту дзеці пабывалі на розных станцыях, дзе яны пазнаёміліся з дзяржаўнай сімволікай Беларусі, з легендамі ўзнікнення нашага горада Бабруйска, з прыроднымі сімваламі нашай краіны, а таксама чыталі вершы беларускіх пісьменнікаў.

У мэтах выхавання падрастаючага пакалення ў духу дружбы і міралюбнасці да братняга народа Расіі адбылося відэападарожжа ў краіну-суседку «Адным лёсам звязаны». Дзеці адправіліся ў віртуальнае падарожжа па Расіі і пазнаёміліся з яе культурай, побытам, дзяржаўнымі сімваламі і народнымі традыцыямі. Каб параўнаць брацкія краіны, школьнікі ўспомнілі ўсё, што ведаюць пра



Падарожжа ў краіну-суседку «Адным лёсам звязаны». Фота В. Хархалёвай

сваю Радзіму, адказаўшы на пытанні віктарыны «Беларусь – мая Радзіма». Дзеці зрабілі выснову, што паміж расіянамі і беларусамі ёсць шмат агульнага, таму сяброўства нашых краін будзе толькі працягвацца і мацнець.

Нельга быць патрыётам сваёй краіны і не любіць, і не берагчы родную прыроду. Некалькі гадоў наша бібліятэка працуе над праектам «Лесавічок» па экалагічным выхаванні дзяцей. Своеасаблівым сімвалам праекта стаў добры дзядок Лесавічок, які часта наведвае заняткі. Ён прыходзіць да дзяцей са сваімі ляснымі загадкамі, віктарынамі, гульнямі, падарункамі.

Да Міжнароднага дня Зямлі для ўдзельнікаў праекта вядучы яго персанаж дзядок Лесавічок зладзіў сапраўднае свята «Чатыры царствы на Зямлі». Дзеці з цікавасцю назіралі з'яўленне на ім гасцей: усіх чатырох пор года – Зімы, Вясны, Лета і Восені. Кожная з гасцей расказала дзецям аб экалагічных праблемах, якія суправаджаюць прыроду ў яе пару года, і як юныя эколагі могуць дапамагчы планеце стаць чысцей і прыгажэй. Лесавічок пагуляў з дзецьмі ў экалагічныя гульні і ўзяў з іх клятву аб тым, што яны заўсёды будуць любіць, берагчы і абараняць прыроду.

Выпадкова ці наўмысна чалавек губіць усё жывое вакол сябе, пакутуюць жывёлы, расліны, пападаючы ў Чырвоную кнігу. На занятку экалагічнага праекта «Гадзіна-роздум “Чырвоная кніга прыроды”» ў госці да хлопчыкаў і дзяўчынак прыйшоў казачны персанаж кнігі А. Шарко Гномік Спасайка, які ахоўвае жывёл лесу ад бед. Ён пазнаёміў дзяцей з прадстаўнікамі Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь і жывёламі, якіх ужо няма на планеце. Школьнікі паабяцалі гноміку клапаціцца аб навакольным свеце і тых яго прадстаўніках, якія маюць патрэбу ў абароне.

Вельмі важна, каб школьнікі з дзяцінства вучыліся стваральнай дзейнасці ў прыродзе, уступалі з ёй у цесны кантакт. З гэтай мэтай дзеці з праекта «Лесавічок» прынялі актыўны ўдзел у штогадовай гарадской экалагічнай акцыі «Пасадзі дрэва». Разам з кіраўніком праекта ў дзіцячым парку горада імі былі пасаджаны восем маладых ялінак. Такія мерапрыемствы гуртуюць школьны калектыў і вучаць зносінам адзін з адным і прыродай.

Удзельнікі экалагічнага праекта «Лесавічок» вырашылі дапамагчы сваім маленькім сябрам – птушкам – і прынялі ўдзел у экалагічнай акцыі «Дапаможам птушкам перазімаваць». Хлопцы змайстравалі кармушкі для птушак і развешалі іх у школьным парку. Кожную раніцу перад урокамі дзеці прыносілі птушачкам трохі проса і семак, каб пракарміць іх у зімовыя халады.

У сакавіку 2024 г. удзельнікі экалагічнага праекта «Лесавічок» адны з першых падрыхтаваліся да сустрэчы птушак. Дзеці прынялі ўдзел у экалагічнай акцыі «Шпакі прыляцелі!». З дапамогай бацькоў яны зрабілі шпакоўні і ўрачыста ўзнялі іх на дрэвах у дзіцячым парку. Птушкі былі ўдзячныя школьнікам за клопат і неўзабаве пацешылі наведвальнікаў парку вясёлымі песнямі.

Выдатным майскім днём удзельнікі экалагічнага праекта «Лесавічок» здзейснілі ў Цэнтры юных натуралістаў г. Бабруйска экалагічную экскурсію, якая называлася «Бліжэй да прыроды». Менавіта там дзецям прадставілася магчымасць сапраўды стаць бліжэй да жывёл, якія мірна суіснуюць на невялікай утульнай тэрыторыі. Вучняў чакалі ласкавыя пухнатыя трусы, марскія свінкі, хамячкі і козачкі. Па лужку свабодна гуляў бусел, а ў невялікім басейне плавалі важныя краснаухія чарапахі. Усе гэтыя мілыя жывёлы прывялі ў захапленне юных аматараў прыроды. Дзеткі абяцалі часцей наведваць і падкармліваць маленькіх гадаванцаў.


Экалагічная акцыя «Дапаможам птушкам перазімаваць».
Фота В. Хархалёвай

Пасля заканчэння навучальнага года ў рамках праекта «Лесавічок» адбыўся заключны занятак – экалагічны конкурс-гульня «На старт, эказнайкі!» На конкурсе былі правераны і замацаваны веды аб прыродзе, атрыманыя вучнямі на працягу навучальнага года, а таксама дзеці памераліся

сіламі ў экалагічных віктарынах, гульнях. Пры падвядзенні вынікаў класу быў уручаны дыплом і ганаровыя граматы самым актыўным удзельнікам праекта.

На базе экалагічнага праекта ў чытальнай зале бібліятэкі арганізаваны жывы куток «Лесавічок і кампанія». Школьнікі з задавальненнем даглядаюць за яго жыхарамі – чарапахай Тарцілай, акварыумнымі рыбкамі і папугаем Арчы. У абавязках дзяцей – пакарміць і пачысціць жыллё гадаванцаў кутка, якія заўсёды рады клопату і ўвазе з боку дзяцей.

На час летніх канікул для ўдзельнікаў праекта быў абвешчаны фотаконкурс «Экалагічны патруль». Дзеці атрымалі заданне зрабіць фотаздымкі са сваімі любімымі хатнімі жывёламі. Вучні апынуліся сапраўднымі аматарамі прыроды, яны з задавальненнем фатаграфавалі не толькі хатніх гадаванцаў, але і прадстаўнікоў дзікай прыроды – гіганцкіх слімакоў, папугаяў, аленяў. Палюбавацца на маляўнічыя фотаздымкі змаглі ўсе карыстальнікі бібліятэкі. Фотавыстава працавала цэлы месяц. Пераможцы конкурсу атрымалі граматы і памятныя падарункі за ўклад у працу экалагічнага праекта «Лесавічок».

Глыбокі след на нашай зямлі пакінула Вялікая Айчынная вайна. Яе агонь абпаліў кожную беларускую сям'ю. І новыя пакаленні беларусаў павінны памятаць аб гэтым.

2024 год – год 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Калі скончылася Вялікая Айчынная вайна, тады здавалася, што аб гэтым страшным часе будуць памятаць заўсёды. Звяртанне да святой тэмы подзвіга беларускага народа традыцыйнае для нас, бібліятэкараў. За плячамі вялікі вопыт работы па ваенна-патрыятычным выхаванні маладога пакалення. З 2023 г. Дзіцячая бібліятэка № 6 імя М. Астроўскага працуе над праектам «Сохраняем память о войне». Праз чытанне кніг патрыятычнага кірунку, цікавыя і пазнавальныя мерапрыемствы бібліятэкары выхоўваюць і развіваюць у дзяцей і падлеткаў патрыятычную свядомасць і актыўную грамадзянскую пазіцыю; садзейнічаюць выхаванню асобы, прыналежнай да гісторыі і культуры свайго народа.

Праводзіцца шмат цікавых, пазнавальных мерапрыемстваў: вечарыны-сустрэчы, урокі мужнасці, часы гісторыі, выстаўкі-экспазіцыі. У чытальнай зале створаны куток памяці «Через всё прошли и победили», які ўяўляе сабой выставу-экспазіцыю, дзе прадстаўлены не толькі кнігі, але і прадметы ваенна-гістарычнага мінулага нашай краіны: салдацкі рукзак, галаўныя ўборы салдата (шлем танкіста, пілотка, каска артылерыста). Таксама на экспазіцыі ёсць фотаздымкі і медалі савецкага салдата. У раздзеле выставы «Детство и война» прадстаўлены кнігі пра беларускіх школьнікаў – герояў Вялікай Айчыннай вайны. Выстава-экспазіцыя заўсёды прыцягвае ўвагу карыстальнікаў бібліятэкі і вельмі папулярная сярод дзяцей і падлеткаў, бо дапамагае больш глыбока раскрыць тэму вайны.

Аддаючы даніну павагі тым, хто праявіў вялікую сілу духу, самаадданасць, гераізм, выконваючы свой абавязак у Афганістане, у Дзіцячай бібліятэцы № 6 імя М. Астроўскага кожны год праходзяць сустрэчы з воінамі-інтэрнацыяналістамі, на якія запрашаюцца пастаянныя госці – Валерый Анатольевіч Марчанка і Уладзімір Аляксеевіч Бардачоў. Шмат гадоў таму для іх гэта вайна скончылася, але яны памятаюць кожны дзень жыцця ў Афганістане, як быццам гэта было ўчора.

Да 35-годдзя з дня вываду войск з Афганістана бібліятэка правяла сустрэчу з воінамі-інтэрнацыяналістамі «Время выбрало нас».

Дзеля ілюстратыўна-інфармацыйнай падтрымкі сустэчы была арганізавана выстава-ўспамін «Афганская вайна ў лёсе бабруйчан». На выставе былі прадстаўлены фатаграфіі з асабістых архіваў воінаў-інтэрнацыяналістаў і звесткі пра іх службу ў Афганістане.

Свята абаронцаў Айчыны – гэта свята сапраўдных мужчын, а таксама хлопчыкаў, якія вырастуць і стануць абаронцамі. Дзень 23 лютага стаў добрай нагодай для выхавання ў школьнікаў гонару за нашых абаронцаў, пачуцця патрыятызму і абавязку перад Радзімай.

Дзіцячая бібліятэка № 6 імя М. Астроўскага падрыхтавала пазнавальна-конкурсную праграму «Служыць Айчыне – вялікі гонар». Хлопчыкі і дзяўчынкі ўдзельнічалі ў конкурсах і гульнях на спрыт, сілу, пазнаёміліся з родамі войск нашай доблеснай арміі і вядомымі палкаводцамі.

Да Дня Перамогі бібліятэка арганізавала сустрэчу з ветэранам «Героі жывуць, пакуль іх помняць». На сустрэчу з вучнямі прыйшоў ветэран Вялікай Айчыннай вайны М. Волчак. Ён расказаў пра свой франтавы лёс, што давялося перажыць у ваенны час, якой цаной была заваявана Перамога. Ветэран нагадаў усім прысутным, як важна памятаць пра вайну, каб яна не паўтарылася і пажадаў

школьнікам вырасці годным пакаленнем, якое ў будучыні зможа абараніць нашу Айчыну, нашу граніцу ад ворагаў. Дзеці ўважліва, затаіўшы дыханне, слухалі ветэрана, задавалі пытанні пра вайну.

Кожная франтавая песня мае сваю цікавую і часта захапляльную гісторыю. Бібліятэкар пазнаёміла прысутных з гісторыяй стварэння песень «Священная война», «На безымянной высоте», «Землянка» і інш. Школьнікі даведаліся, што песні, створаныя ў гадзіну суровых выпрабаванняў, спявалі не толькі воіны.

Да Міжнароднага дня вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў, які ўсталяваны ў памяць аб інтэрнацыянальным паўстанні 11 красавіка 1945 г. вязняў канцлагера Бухенвальд, Дзіцячая бібліятэка № 6 імя М. Астроўскага правяла ўрок мужнасці «Не гаснет памяти свеча». Падчас мерапрыемства ўдзельнікі паглядзелі фільм пра вязняў канцлагераў, паслухалі вершы аб падзеях тых жудасных гадоў. Затым вядучая азнаёміла прысутных з інфармацыяй аб лагерах смерці Майданак, Дахаў, Саласпілс, Бухенвальд. Асаблівая ўвага была звернута на канцлагеры і гета, якія размяшчаліся на беларускай зямлі і ў нашым родным горадзе.

Супрацоўнікі Дзіцячай бібліятэкі № 6 імя М. Астроўскага ў сваёй рабоце рэгулярна звяртаюцца да тэмы спаленых вёсак – тэмы, пра якую страшна гаварыць. Але толькі так можна захаваць памяць пра жахі вайны.

З гэтай мэтай для школьнікаў была праведзена гадзіна памяці «Памяць і боль беларускай зямлі: Боркі». Спаленыя вёскі Кіраўскага раёна жывуць не толькі ў народнай памяці, пра іх пішуць вершы і паэмы, ставяць спектаклі ў тэатрах, робяць гэта для таго, каб чалавецтва памятала пра смяротную пагрозу, якую яно пазбегла. Так і ў паэме «Марыйка», аўтарам якой з'яўляецца наш зямляк Аляксандр Казека, і ў рамане «Каратели» Алеся Адамовіча жыве памяць аб трагедыі, якая адбылася ў Борках.

Ні на адной геаграфічнай карце няма сёння гэтай беларускай вёскі. Знішчаная фашыстамі 15 чэрвеня 1942 г. яна так і не была адноўлена. Гэтай страшнай трагедыі была прысвечана гадзіна памяці «Звон Хатыні». Аповед бібліятэкара закрануў падзеі таго часу. Падлеткі зразумелі, што колькі б гадоў не прайшло з дня Хатынскай трагедыі, для беларускага народа памяць пра яе застанецца назаўсёды.

У межах патрыятычнай акцыі «Спасибо деду за Победу» ўсе ўдзельнікі акцыі прачыталі шмат кніг пра вайну, бібліятэкары правялі патрыятычныя ўрокі, дзеці падрыхтавалі паведамленні аб сваіх прадзедах, удзельніках Вялікай Айчыннай вайны і распавялі аб іх подзвігах, заслужаных узнагародах.

Для жыхароў нашага горада бібліятэка падрыхтавала выстаўкі ў вокнах: «Прочитанная книга о войне – твой подарок ко Дню Победы» знаёміць з кнігамі пра Вялікую Айчынную вайну, выстаўка «Имя тебе – победитель» знаёміць з героямі вайны, якія прымалі ўдзел у вызваленні Беларусі.

Дзіцячая бібліятэка № 6 імя М. Астроўскага кожны год прымае ўдзел у міжнароднай акцыі «Читаем детям о войне», ініцыюемай Самарскай абласной дзіцячай бібліятэкай і прысвечанай Дню Перамогі.

Супрацоўнікі дзіцячай бібліятэкі заўсёды творча падыходзяць да стварэння яе станоўчага іміджу. І таму на працягу года, згодна з порамі года, у чытальнай зале афармляецца фотазона. Таксама фотазона заўсёды афармляецца да знамянальных дат: Дзень памяці воіна-інтэрнацыяналіста, Дзень абаронцаў Айчыны, Дзень Перамогі, Дзень ведаў, Дзень роднай мовы, Дзень бібліятэк. Фотазона пазначае тэматыку мерапрыемства, надае яму ўрачыстасць і стварае святочны настрой наведвальнікам.

Па выніках XXXII Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» работа бібліятэкі была адзначана дыпломам другой ступені ў намінацыі «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем».

Summary

The article presents the activities of children's library № 6 of Bobruisk in the patriotic education of the younger generation.



«Бібліятэчны свет», 2024, № 3 (138). Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1223. Падпісана да друку 10.06.2024. Фармат 60x84 1/8.
Гарнітура «Helios». Лічбавы друк. Ум. друк. арк. 3,72. Тыраж 436 экз. Заказ 1281. Кошт свабодны.
Выдавец і паліграфічнае выкананне: дзяржаўная ўстанова «Нацыянальная бібліятэка Беларусі».
ЛП № 02330/182 ад 30.07.2009.
Пр. Незалежнасці, 116, 220114, г. Мінск.
© «Бібліятэчны свет», 2024